БИБЛИОТЕКА
БГУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ
"Залатая літара" ў намінацыі "Найлепшая шматтыражная газета"

12 чэрвеня 2009 года, № 10-11 (2003-2004)

## ВІНШУЕМ!

***Рэктар БДУ прафесар Сяргей Абламейка, прарэктар па навуковай рабоце прафесар Алег Івашкевіч і загадчык кафедры біяфізікі фізічнага факультэта прафесар Сяргей Чаранкевіч абраны акадэмікамі НАН РБ 5 чэрвеня на агульным сходзе Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.***

Такім чынам, на сёння на пастаяннай аснове ў Беларускім дзяржаўным універсітэце працуе ажно 6 акадэмікаў (акрамя вышэйзгаданых гэта яшчэ прафесары Фёдар Капуцкі, Анатоль Лесніковіч і Аляксандр Чарняўскі) і столькі ж членаў-карэспандэнтаў НАН РБ (прафесары Якаў Радына, Юрый Харын, Фадзей Камароў, Аляксандр Астапеня, Міхаіл Дзямчук, Віктар Корзюк).

Усё гэта сведчыць пра тое, што БДУ займае асаблівае месца ў сістэме навуковых арганізацый Рэспублікі Беларусь.

УШАНАВАННЕ

## Найлепшы паказчык – у БДУ

***Лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў ВНУ 2008 года ўшанавалі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце 3 чэрвеня.***



*Лаўрэаты конкурсу з ліку студэнтаў БДУ разам з афіцыйнымі асобамі*

Цырымонія ўзнагароджання прайшла з удзелам міністра адукацыі Беларусі Аляксандра Радзькова, яго першага намесніка Аляксандра Жука, старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Уладзіміра Мацюшкова, першага намесніка старшыні ВАК Мікалая Манака, рэктара БДУ Сяргея Абламейкі і, вядома, саміх лаўрэатаў.

Дыпломы лаўрэатаў атрымалі 77 маладых навукоўцаў з ВНУ нашай краіны, з іх 11 – з БДУ (гэта самы высокі паказчык, да прыкладу, у БДМУ – 7 аўтараў-лаўрэатаў, у БДЭУ і БНТУ – па 6 аўтараў-лаўрэатаў).

Усяго ж у конкурсе ўдзельнічалі студэнты і выпускнікі 57 ВНУ (у тым ліку філіялаў), якія прадставілі 3773 працы. Гэта на 452 працы больш, чым у 2007 годзе, што шмат у чым абумоўлена рашэннем Міністэрства адукацыі пашырыць колькасць навуковых кірункаў, па якіх ідзе фарміраванне секцый рэспубліканскага конкурсу.

**Паводле інфармацыі НДЧ-ГУН**

## Чытайце ў нумары:

РЭНАМЭ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ НАВУКІ
Пра пачатковыя конкурсу імя У.Пічэты і А.Сеўчанкі БДУ і гісторыю стварэння адпаведных нагрудных знакаў – універсітэцкіх узнагарод нашым найлепшым вучоным
Стар. 2

СЛУЖУ АЙЧЫНЕ!
У Белдзяржуніверсітэце шанавалі першых выхаванцаў-афіцэраў, выпускнікоў ваеннага факультэта БДУ
Стар. 3

МВА – ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЯ МАГІСТРАТУРА
Інтэрв'ю з кіраўніком праграмы МВА, намеснікам дэкана Інстытута бізнэсу і менеджменту тэхналогій Наталляй МАКАЕВАЙ
Стар. 5

"ВЫКЛАДЧЫК, ЯКІ СПЯВАЕ, ЦІКАВЫ ДЛЯ СТУДЭНТА"
З нагоды 30-гадовага юбілею народнага хору народнай песні "Родніца" гутарка з яго кіраўніком Уладзімірам ЗЯНЕВІЧАМ
Стар. 7

МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Бліжэй да Еўропы

***Інфармацыйны пункт Савета Еўропы адкрыўся 8 чэрвеня на базе Белдзяржуніверсітэта ў вучэбным корпусе па вул. Кальварыйская, 9.***



*Рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка разам з ганаровымі гасцямі на брыфінгу для СМІ*

Ва ўрачыстай цырымоніі прынялі ўдзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў, Старшыня Камітэта Міністраў Савета Еўропы, міністр замежных спраў Славеніі Самуэль Жбогар, намеснік Генеральнага сакратара Савета Еўропы Мод дэ Бор-Букікіо, спецыяльны госць – дакладчык па Беларусі камісіі ПАСЕ па палітычных пытаннях Андрэа Рыгоні, прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, шэрага міністэрстваў нашай краіны, а таксама дыпламатычнага корпуса і грамадзянскай супольнасці Беларусі.

Інфармацыйны пункт Савета Еўропы ў Мінску створаны ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 сакавіка 2009 г. і з'яўляецца структурным падраздзяленнем БДУ. Яго мэта – павышэнне інфармаванасці дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, СМІ, ВНУ і грамадзян нашай краіны пра дасягненні, палітыку і дзейнасць СЕ, а таксама асноўныя каштоўнасці і прававыя інструменты з прадстаўленнем адпаведных матэрыялаў і дакументацыі.

Інфапункт СЕ мяркуе стварыць у нашай краіне сучасную бібліятэку выданняў Савета Еўропы, у тым ліку на лічбавых носьбітах, з доступам у Інтэрнэт; арганізоўваць лекцыі, семінары, канферэнцыі, круглыя сталы і інфармацыйныя кампаніі і ў цэлым спрыяць узаемадзеянню паміж Беларуссю і Саветам Еўропы.

У сваёй прамове Самуэль Жбогар адзначыў, што ўвасабленне гэтага праекта ў жыццё заняло 4 гады. Упершыню з адпаведнай ініцыятывай выступіў тагачасны генсек ПАСЕ Рэне Вандэрліндэн. У далейшым працы СЕ ў Беларусі садзейнічалі калегі са Славакіі, Швецыі, Іспаніі, якія па чарзе ўзначальвалі Камітэт Міністраў. Спадару Жбогару вельмі прыемна, што менавіта Славеніі выпаў гонар адкрываць інфапункт у нашай краіне. Еўрапейскі міністр падзякаваў БДУ за супрацоўніцтва і хацеў бы разлічваць на яго як на асноўнага партнёра.

Міністр замежных спраў нашай краіны Сяргей Мартынаў ахарактарызаваў гэту падзею як знакавую ва ўзаемаадносінах Еўропы і Беларусі. Ён асабліва падкрэсліў, што падобная структура ўпершыню ўзнікла на тэрыторыі дзяржавы, якая не з'яўляецца членам Еўрасаюза, і палічыў гэта сігналам адкрытасці Беларусі і добрай волі Еўропы, вынікам змянення падыходаў Еўропы да Беларусі. Сімвалічна, што адкрыццё інфапункта СЕ ў Мінску адбылося ў год 60-годдзя найстарэйшай панеўрапейскай арганізацыі і павінна пакласці пачатак якасна новаму этапу супрацоўніцтва. Сяргей Мартынаў падзякаваў рэктару БДУ за ўнёсак у стварэнне інфапункта і выказаў упэўненасць, што гэта паслужыць умацаванню міжнароднага аўтарытэту Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Інфармацыйны пункт Савета Еўропы размясціўся ў каб. 202 у крыле Інстытута журналістыкі. Па словах каардынатара праекта ад БДУ прарэктара Уладзіміра Клюні, быў праведзены шматступеньчаты адбор кандыдатаў на пасады дырэктара і рэферэнта інфапункта. Пасля папярэдняга сумоўя ў Страсбургу і заключнай атэстацыі ў БДУ гэтую справу даверылі адпаведна Ігару Горскаму, выхаванцу нашага журфака, і выпускніцы МДЛУ Наталлі Дзяргай.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

## Весткі з рэктарата

ЗАГАДАМ рэктара створана працоўная група "Рэйтынг БДУ". Асноўная яе задача: арганізацыя працы па павышэнні рэйтынгу нашай ВНУ ў міжнародных рэйтынгах сусветных універсітэтаў. Кіраўнік – дырэктар ЦПРА Міхаіл Гусакоўскі.

* * *

РЭКТАР Сяргей Абламейка 14-15 мая ўзяў удзел у XVI Канферэнцыі міністраў адукацыі дзяржаў-удзельніц СНД, а таксама пасяджэнні Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаў-удзельніц СНД. Падчас працы міжнароднага Савета Сяргей Абламейка правёў перамовы з рэктарам Таджыкскага нацыянальнага універсітэта Нурыдзінам Саідавым.

* * *

ПЕРСПЕКТЫВЫ развіцця супрацоўніцтва абмеркаваны на сустрэчах рэктара 20-22 мая з кіраўніком Федэральнага універсітэта тэхналогій г. Міна (Нігерыя) прафесарам М.С. Ауду, а таксама паслом Ірана ў Беларусі Сеедам Абдалой Хасейні.

* * *

ПРАРЭКТАР па навуковой рабоце прафесар Алег Івашкевіч сустрэўся 26 мая з дэлегацыяй Хэйлунцзянскага інстытута нафтахіміі на чале з яго прэзідэнтам прафесарам Бай Сюефэнам. Госці наведалі таксама НДІ ФХП і хімічны факультэт, дзе была прадстаўлена прэзентацыя Хэйлунцзянскага інстытута нафтахіміі і праведзены сумесныя навуковыя эксперыменты па выкарыстанні тэхналогій, распрацаваных у НДІ ФХП. У выніку падпісаны кантракт на распрацоўку ўзораў тэрмаўстойлівых матэрыялаў з новымі ўласцівасцямі.

* * *

ФІЗКУЛЬТУРНА-АЗДАРАЎЛЕНЧАЯ база БДУ з'явіцца ў наступным навучальным годзе ў раёне вул. Курчатава. Першым этапам будаўніцтва стане стварэнне адкрытых спартыўных пляцовак, дзе можна будзе займацца лёгкай атлетыкай, гуляць у футбол, валейбол, баскетбол. Другі этап прадугледжвае ўзвядзенне паветрана-апорнага спартыўнага збудавання (надзіманага манежа). Такое рашэнне прынята 26 мая на пасяджэнні рэктарата.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ГІСТОРЫІ БДУ

# РЭНАМЭ УНІВЕРСІТЭЦКАЙ НАВУКІ

***Нядаўна Геральдычны савет пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь зацвердзіў нагрудныя знакі “Лаўрэат прэміі імя У.І. Пічэты БДУ” і “Лаўрэат прэміі імя А.Н. Сеўчанкі БДУ”, якімі з 2006 года ўзнагароджваюцца найлепшыя даследчыкі альма-матэр у галіне сацыяльна-гуманітарных і прыродазнаўча-тэхнічных навук.***
***Такім чынам, Беларускі дзяржаўны універсітэт стаў першай айчыннай ВНУ, якая адзначае заслугі сваіх навукоўцаў на такім узроўні, і дадаў яшчэ адзін найважнейшы атрыбут да свайго лідарскага статусу ў сістэме адукацыі краіны.***



*Акадэмік Фёдар Мікалаевіч Капуцкі*

## ПРЭМІІ

Паводле Палажэння аб конкурсе па прысуджэнні прэмій імя У.І.Пічэты і А.Н.Сеўчанкі, адпаведныя прэміі ўручаюцца за выбітныя дасягненні, якія ўключаюць:

навуковыя працы па перспектыўных кірунках, якія робяць значны ўнёсак у развіццё адпаведнай галіны навукі і тэхнікі;

стварэнне новай тэхнікі, тэхналогій і матэрыялаў;

працы па зберажэнні рэсурсаў і энергіі, ахове навакольнага асяроддзя і рашэнне іншых важных для краіны задач;

распрацоўку новых адукацыйных тэхналогій, якія істотна павышаюць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў;

стварэнне падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў і навучальнага абсталявання.

Прысуджэнне прэмій імя У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі здзяйсняецца на конкурснай аснове. Прадстаўленыя працы ацэньваюць дзве камісіі. Рашэнне камісій зацвярджаецца Вучоным саветам універсітэта і афармляецца загадам рэктара.

З 2009 г., як ужо паведамлялася ў газеце “Універсітэт”, у межах штогадовага традыцыйнага конкурсу навукоўцаў пачаў праводзіцца конкурс для маладых даследчыкаў (дактароў навук ва ўзросце да 45 гадоў, кандыдатаў навук – да 35 гадоў, навукоўцаў без ступені – да 30 гадоў) у адпаведных намінацыях. На суседняй паласе прыведзены поўны спіс прэтэндэнтаў на суісканне прэмій сёлета.

## НАГРУДНЫЯ ЗНАКІ

Выканаў згаданыя нагрудныя знакі мастак Уладзімір Васюк, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Узнагароды былі выраблены яшчэ ў 2003 г. Упершыню ўручаны ў 2006 г. да 85-годдзя альма-матэр, наступны раз – у 2008 г., неўзабаве пасля чаго і была завершана працэдура іх афіцыйнай рэгістрацыі.

Па словах намесніка начальніка УПКВК *Аляксандра Захарава*, упершыню нагрудныя знакі былі прадугледжаны ў Палажэнні аб прэміях 2001 г. Мастацкае ўвасабленне ідэі адбывалася пры актыўным удзеле тагачаснага першага прарэктара БДУ прафесара Алега Яноўскага, гісторыка па адукацыі, які, дарэчы, нароўні з нябожчыкам прафесарам Леанідам Лойкам, з’яўляецца распрацоўшчыкам асноўнага сімвала альма-матэр – знакамітай “Папараць-кветкі”. У афармленні нагрудных знакаў таксама шмат сімвалізму: медальён з малюнкам легендарных навукоўцаў ляжыць на двух скрыжаваных беларускіх ручніках валошкавага колеру (нацыянальныя матывы). Ад медальёна зыходзяць 12 промняў па колькасці месяцаў у годзе: прэмія ўручаецца штогод. Найболей цяжкавыканальнай часткай знака з’яўляецца сам медальён. Трэба было дамагчыся партрэтнага падабенства акадэмікаў А.Н. Сеўчанкі і У.І. Пічэты. Такія віды прац у былым Савецкім Саюзе мог выканаць толькі Ленінградскі манетны двор. Тым не менш, было вырашана, што беларускую ўзнагароду павінна вырабіць айчынная фірма. Выбар прыпаў на дызайн-студыю “СЭНС”, якая пераканала кансультантаў у сваіх магчымасцях. Якасць выканання кожнага з элементаў знака дбайна кантралявалася экспертамі-гуманітарыямі. У 2003 г. 150 гатовых узнагарод былі перададзены БДУ. Паверхня нагрудных знакаў пасярэбраная, і ў цэлым яны ўяўляюць сабой сапраўдны твор мастацтва.

*Прафесар Алег Яноўскі* распавёў, што пасля набыцця галоўнага універсітэцкага сімвала (“Папараць-кветка” зацверджаная ў якасці афіцыйнай эмблемы БДУ ў 1999 г. – ***заўв. Рэд.***) паўстала пытанне і пра заснаванне ўзнагарод-сімвалаў, якімі маглі б адзначацца нашы найлепшыя навукоўцы. “Апроч матэрыяльнага складніка, павінна было быць нешта, што заставалася б лаўрэату як памяць і сведчыла б пра яго заслугі”, – лічыць Алег Антонавіч. Гэтае пытанне абмеркавалі на рэктараце, і ў выніку была створана адмысловая камісія ў складзе вядомых універсітэцкіх гісторыкаў. “Праца над эскізамі вялася больш за год, – успамінае Алег Антонавіч. – Асноўная складанасць заключалася ў дакладнай перадачы профілю нашых рэктараў. Так, не захаваўся фотаздымак У.Пічэты з яго профілем”. У цэлым, нагрудныя знакі ствараліся на ўзор падобных дзяржаўных узнагарод. І тут, як і ў шматлікіх іншых рэчах культурна-духоўнага значэння (эмблема, помнікі, музей гісторыі, гімн) БДУ, выступіў першапраходцам. Алег Яноўскі перакананы, што ўсе гэтыя атрыбуты робяць наша жыццё цікавейшым, больш адухоўленым і аб’ядноўваюць усіх у адзіную супольнасць. І з гэтым нельга не пагадзіцца.

## ГІСТОРЫЯ

Першае Палажэнне аб прэміях У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі было распрацавана ў 1993 г., тады ж вызначыліся і першыя лаўрэаты – доктар гістарычных навук прафесар У.С. Кошалеў за даследаванне праблем сацыяльна-палітычнай гісторыі Егіпта новага і найноўшага часу і доктар біялагічных навук прафесар І.К. Лапацін за цыкл прац, прысвечаных новаму кірунку ў вывучэнні энтамафауны.

З тых часоў лаўрэатамі конкурсу сталі 54 даследчыкі. Сярод іх – 13 “гуманітарыяў” і 41 “прыродазнавец”. Перавага другой катэгорыі абумоўленая, як правіла, калектыўным аўтарствам распрацовак у галіне прыродазнаўчых навук. Уладальнікамі прэмій імя А.Н. Сеўчанкі ў розныя гады былі такія значныя навукоўцы, дактары навук, як: В.С. Аношка (двойчы!), акадэмік Л.В. Валадзько (пасмяротна), А.І. Камяк, Д.С. Умрэйка, А.Б. Антаневіч, Г.Я. Кабо, Ю.С. Харын, В.Н. Кісялёў, акадэмік Ф.М. Капуцкі, Я.С. Варапай, А.П. Клішчанка, А.А. Мінько, У.І. Папечыц, Г.І. Марцінкевіч, І.І. Пірожнік, член-карэспандэнт НАН Беларусі Ф.Ф. Камароў, У.М. Барздоў, А.Ф. Камароў, Т.М. Вараб’ёва, У.Б. Аджаеў, М.А. Паклонскі, Д.В. Свірыдаў, М.А. Жураўкоў, М.Д. Мартыненка; а прэмій імя У.Пічэты – І.А. Юхо, А.І. Зелянкоў, В.Ф. Шалькевіч, В.Н. Рабцэвіч, А.В. Дулаў, Н.Б. Мячкоўская, член-карэспандэнт НАН Беларусі А.А. Лойка, В.А. Фядосік, І.І. Марціновіч, У.Е. Снапкоўскі.

Уручаць прэміі найболей годным вучоным універсітэта задумала ў пачатку 1990-х кіраўніцтва БДУ на чале з тагачасным рэктарам *акадэмікам Фёдарам Капуцкім* (цяпер ён загадчык лабараторыі ў НДІ ФХП). Па словах Фёдара Мікалаевіча, гэта быў складаны час для універсітэцкай навукі і краіны ў цэлым. Адстойваць інтарэсы навукі прыходзілася асабіста і даказваць гэта канкрэтнымі справамі. Чаго варты прыклад, які ўжо стаў класікай, калі рэктар насіў старшыню Савета Міністраў партфель са зліткам перапрацаванага золата для дэманстрацыі дасягненняў хіміі. “Трэба было шукаць магчымасці для ўтрымання ва універсітэце маладых даследчыкаў і падтрымкі навукоўцаў, – гаворыць Фёдар Мікалаевіч, – для гэтага мы ўсяляк імкнуліся дапамагаць супрацоўнікам у рашэнні жыллёвых праблем, а таксама стымуляваць матэрыяльна. І прэміі ў эквіваленце 1 тыс. долараў былі немалаважным фактарам”. “Асобы У. Пічэты і А. Сеўчанкі з’яўляюцца знакавымі для нашага універсітэта. Філолаг-славіст Уладзімір Іванавіч Пічэта – “бацька-заснавальнік” БДУ, яго першы рэктар і галоўны арганізатар. Фізік Антон Нікіфаравіч Сеўчанка заклаў навуковую аснову прыродазнаўства ва універсітэце. Абодва – вядомыя ва ўсім свеце вучоныя. Заснаванне прэмій у гонар гэтых выбітных людзей заканамернае”, – лічыць Фёдар Мікалаевіч.

Загадчык кафедры фізічнай оптыкі *прафесар Анатоль Мінько* быў адным з суаўтараў істотных змен у Палажэнні аб прэміях імя У.Пічэты і А.Сеўчанкі ў 2001 г. Па яго словах, былі распачатыя захады па прыцягненні да ўдзелу ў конкурсе як мага большай колькасці выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў ад усіх падраздзяленняў універсітэта, навукоўцаў краіны, а таксама па павышэнні статусу і значнасці конкурсу. Для гэтага, з аднаго боку, нароўні з агульнай камісіяй, куды раней наўпрост накіроўваліся ўсе конкурсныя працы, былі створаны камітэты па розных галінах навукі (3 па гуманітарным і 4 па прыродазнаўча-навуковым профілі), кожны з якіх складаўся з 7 чалавек. Усе падраздзяленні дэлегавалі ў камітэты сваіх прадстаўнікоў паводле ўсталяваных квот. З іншага боку, для ацэнкі конкурсных прац была распрацавана працэдура рэцэнзавання іх незалежнымі экспертамі, прыцягнутымі з боку на прынцыпах канфідэнцыйнасці. Гэта спрыяла аб’ектыўнаму адбору найлепшых прац. Кожны камітэт мог падаваць на разгляд агульнай камісіі не больш за адну працу. Акрамя працэдуры экспертызы пры разглядзе прац улічваліся і іншыя крытэрыі. Напрыклад, адсутнасць у матэрыялах, прадстаўленых на конкурс, прыкмет даследаванняў, прэміраваных раней, узровень прадстаўленых публікацый, наяўнасць патэнтаў, практычная значнасць праведзеных даследаванняў і г.д.

Дадзеная арганізацыйная структура і прынцыпы захаваліся ў падкарэктаваным выглядзе да цяперашняга часу.

***ДАВЕДКА***

**Пічэта Уладзімір Іванавіч** (1878 – 1947) – акадэмік, першы рэктар БДУ, адзін з яго стваральнікаў. Яго навуковыя інтарэсы: руская гісторыя, палітычная гісторыя ВКЛ, аграрны лад Беларусі XV – пач. XVIII стст., культура Беларусі эпохі феадалізму, беларуская гістарыяграфія, гісторыя паўднёвых і заходніх славян і г.д. На пасадзе рэктара У.І. Пічэта шмат увагі надаваў навучальна-метадычным пытанням, паляпшэнню матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта і падрыхтоўцы нацыянальных кадраў. Быў ініцыятарам арганізацыі ў БДУ краязнаўства і археалагічных даследаванняў. З першых дзён рэктар пачаў усталёўваць дзелавыя і навуковыя кантакты з замежнымі ВНУ і навуковымі супольнасцямі. Высокі прафесіяналізм У.І. Пічэта выяўляў на ніве педагагічнай дзейнасці. Вялікае значэнне навуковец надаваў выкладанню на беларускай мове, якой сам валодаў і паўсюдна карыстаўся. Падчас 9-гадовай працы ў БДУ кожны год друкаваў па 12-15 кніг, брашур, артыкулаў, дакладаў. Ім напісана каля 500 прац, з якіх каля 150 прысвечаны беларускай тэматыцы.

У 1930 г. ён быў абвінавачаны па т.зв. “справе акадэміка С.Ф. Платонава” і сасланы. Апошнія гады жыцця У.І. Пічэта працаваў у Маскве загадчыкам кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян МДУ, намеснікам дырэктара Інстытута славяназнаўства АН СССР.

**Сеўчанка Антон Нікіфаравіч** (1903 – 1978) – выхадзец з Беларусі. Па заканчэнні БДУ паступіў у аспірантуру ФІАН (1932 г.), з 1934 года аспірант Дзяржаўнага аптычнага інстытута (г. Ленінград). Навуковую працу А.Н. Сеўчанка вёў пад кіраўніцтвам акадэміка С.І. Вавілава. Яшчэ да вайны Антон Нікіфаравіч пачаў займацца вывучэннем люмінесцэнцыі ураніла і рэдказямельных элементаў. У 1952 г. ён абараніў па гэтай тэматыцы доктарскую дысертацыю. У 1953 г. А.Н. Сеўчанка па запрашэнні Акадэміі навук БССР пераязджае на пастаянную працу ў Мінск і абіраецца акадэмікам АН БССР. За кароткі час ён арганізаваў Інстытут фізікі і матэматыкі АН БССР, стаўшы яго першым дырэктарам. Адначасова ён узначаліў створаную ім жа кафедру фізічнай оптыкі ў БДУ. У 1957 г. А.Н. Сеўчанка прызначаецца рэктарам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І. Леніна. Дзякуючы яго высілкам, у 1971 г. пры БДУ створаны НДІ прыкладных фізічных праблем (які цяпер носіць яго імя) – першая навукова-даследчая ўстанова ў вышэйшай школе краіны. З 1972 г. і да сваёй смерці ў 1978 г. Антон Нікіфаравіч – дырэктар гэтага інстытута. А.Н. Сеўчанка – Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны дзеяч навукі БССР.

Амаль 25 гадоў аддаў А.Н.Сеўчанка альма-матэр, 15 з іх – на пасадзе кіраўніка. Пры ім БДУ імкліва рос не толькі як навучальная ўстанова, але і як храм навукі, замацоўваючы тыя падмуркі, якія былі закладзены ў 1920-я гады першым рэктарам – У.І. Пічэтам.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Фота Аляксандра СНАПКА

### З АФІЦЫЙНАГА АПІСАННЯ

Нагрудныя знакі “Лаўрэат прэміі імя У.І. Пічэты БДУ” і “Лаўрэат прэміі імя А.Н. Сеўчанкі БДУ” ўяўляюць сабою крыж сіняга колеру. Канцы крыжа ўвагнутыя ўнутр, утвараючы два скошаныя зубы. Паміж элементамі крыжа размяшчаюцца тры невялікія зубцы.




У цэнтры крыжа ў крузе залатога колеру профільныя малюнкі адпаведна У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі. Вакол гэтых малюнкаў наверсе размяшчаецца надпіс “ЛАЎРЭАТ ПРЭМІІ ІМЯ У.І. ПІЧЭТЫ”, “ЛАЎРЭАТ ПРЭМІІ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ”, а ўнізе – “БДУ”.

Калодка нагруднага знака – блакітны прамавугольнік, які мае зубец, скіраваны ўніз. Усярэдзіне калодак малюнак эмблемы Белдзяржуніверсітэта.

Нагрудны знак выраблясецца з металу белага (серабрыстага) колеру.

Элементы нагруднага знака злучаныя паміж сабой з дапамогай кольца.



УРАЧЫСТАСЦІ



*Урачыстая цырымонія выпуску афіцэраў ваеннага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта ўпершыню адбылася ў БДУ 30 мая.*



# СЛУЖУ АЙЧЫНЕ!

Дзеянне адбывалася ва ўнутраным дворыку насупраць будынка рэктарата. Спачатку з вітальным словам да ўдзельнікаў звярнуўся рэктар Белдзяржуніверсітэта прафесар Сяргей Абламейка. Пасля ўручэння дыпломаў адбылося прыняцце Кодэкса гонару афіцэра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь выпускнікамі факультэта. Новаспечаных афіцэраў павіншаваў намеснік міністра абароны па кадрах генерал-маёр Юрый Меранцоў.



*Віншаванні ад родных*

Усяго ўшаноўвалі 28 выпускнікоў ваеннага факультэта трох спецыяльнасцяў: “Журналістыка”, “Правазнаўства” і “Міжнародныя адносіны”. Для іх 13 сяброў, якія скончылі факультэт у цяперашнім годзе па спецыяльнасцях “Псіхалогія” і “Хімія”, падобная ўрачыстасць чакаецца 28 чэрвеня ў Ваеннай акадэміі.

У цырымоніі ўзялі ўдзел начальнікі структурных падраздзяленняў Міністэрства абароны Беларусі, у чыіх інтарэсах рыхтуюцца кадры, начальства ваеннага факультэта, дэканы факультэтаў БДУ, ветэраны Узброеных Сіл нашай краіны, бацькі выпускнікоў, а таксама айцец Аляксандр з Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы.

Напрыканцы падраздзяленні ваеннага факультэта БДУ прайшлі ўрачыстым маршам.

**ДАВЕДКА**

*Ваенны факультэт БДУ створаны на базе ваеннай кафедры Белдзяржуніверсітэта паводле Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11 чэрвеня 2003 года № 775. Ваенны факультэт здзяйсняе падрыхтоўку кадраў для Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў нашай краіны, якія ствараюцца ў адпаведнасці з айчынным заканадаўствам.*

**Вера ГРАМЧАКОВА**
Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА



*Юрый Меранцоў уручае дыпломы*

ВЫСТАВЫ

# ЗАХАПЛЕННЕ ТВОРЧАСЦЮ

***Выстава “Свет творчасці – свет захапленняў. Мой цёплы дом” ладзілася 14 – 22 мая ў рэктараце БДУ.***



Саюз жанчын праводзіць яе штогод да Дня сям’і. Кожны раз на суд гледача выносяцца ўсё новыя і новыя мастацкія творы, вырабы, унікальныя калекцыі, зробленыя ўласнымі рукамі, малюнкі студэнтаў, дзяцей і іх бацькоў, якія працуюць у БДУ. Ад усіх экспанатаў насамрэч павявае хатняй утульнасцю і сямейным дабрабытам. А калі атмасфера ў сям’і спрыяе самавыяўленню ўсіх яе дамачадцаў, то выйграе і калектыў, у якім паняцці творчая асоба і работнік пачынаюць атаясамлівацца.

Бадай, сімвалам гэтай выставы можна назваць фотаздымкі Аляксандра Шчаснага, студэнта трэцяга курса фізічнага факультэта. На кожным – двое: два буслы, дзве жабы, дзве качкі, а гэта ўжо сям’я. Потым, зразумела, ва ўсіх павінны нарадзіцца дзеці... Дзеці ў Аляксандра Шчаснага – гэта галодныя птушаняты, якія нават на фотаздымку моцна ціўкаюць, раскрыўшы свае дзюбкі ў чаканні маці.

Яго аднакурсніца Надзея Курэйчык здымала ўсё, што грэе душу па-сапраўднаму: божую кароўку, рэчку, галінку яблыні...

Карціны студэнта першага курса ФПМІ Максіма Піліпейкі “Двое”, “Сляпыя”, “Трон” прасякнуты філасофскімі развагамі. Двое ў яго – гэта маленькая дзяўчынка і анёл, якія неспадзявана сустрэлі адзін аднаго і цяпер думаюць, як пазнаёміцца і пасябраваць. Сляпыя – гэта людзі, якія ходзяць у натоўпе па вуліцах вялікага горада, сярод высокіх гмахаў і нічога больш наўкол не заўважаюць, нават таго, што ў іх пад носам на дарозе ляжыць вялізны жолуд, а можа, і не толькі... На трон Максім пасадзіў камедыянта... Побач з яго карцінамі размясціліся габелены Вікторыі Іконнікавай, студэнткі гуманітарнага факультэта, якія здольныя сагрэць не толькі душу, але і ствараць утульнасць дома.

Першыя спробы асэнсаваць свет зрабілі і дзеці нашых выкладчыкаў. Яны малявалі, вышывалі, ляпілі, і ўсё для таго, каб парадаваць сваіх бацькоў, а разам з гэтым здзівіць і нас. Вольга Бардзіян з Інстытута журналістыкі, напрыклад, з задавальненнем паказала вырабы свайго ўнука: Дамір Рыбін змог з асаблівай для сваіх шасці гадоў віртуознасцю выканаць пано, плеценае ніткамі. Творчыя задумкі дзяцей адрозніваліся непадробнай наіўнасцю і даверам да людзей.

На адкрыцці выставы рэктар БДУ Сяргей Абламейка падзякаваў Саюзу жанчын за арганізацыю такіх мерапрыемстваў. Старшыня Святлана Савіна адзначыла, што выставы даюць магчымасць дакрануцца да прыгожага і гэтага не заменіць ніякі кампутар з сучаснымі тэхналогіямі.

**Ганна ЛАГУН**

КОНКУРСЫ

***Згодна з Палажэннем аб конкурсе па прысуджэнні прэмій імя У.І. Пічэты і А.Н. Сеўчанкі БДУ, друкуюцца спісы прэтэндэнтаў 2009 г.***

**Пералік прац на прэмію імя У.І. Пічэты**

*Філалогія і журналістыка*

1. Комплекс кніг па сербістыцы (праф. Чарота І. А.)

*Гісторыя, філасофія і эканоміка*

1. Комплекс навуковых і навучальна-метадычных публікацый па тэме “Беларуская эканамічная мадэль: эвалюцыя, тэарэтычныя асновы, праблемы і перспектывы ўдасканалення” (праф. Байнеў В. Ф.)
2. Манаграфія “Геадэмаграфічныя праблемы і тэрытарыяльная структура сельскага рассялення Беларусі” (дац. Анціпава К. А.)
3. Цыкл прац па гісторыі БДУ ў кірунках даследаванняў па універсітэтазнаўстве і інтэлігентазнаўстве і цыкл падручнікаў і навучальных дапаможнікаў для ВНУ і школ Беларусі, падрыхтаваных за апошнія 20 гадоў (праф. Яноўскі А. А.)
4. Навучальны дапаможнік для студэнтаў ВНУ “Сацыялогія” (праф. Елсукоў А. М., праф. Украінец П. П., праф. Гуцаленка Л. А., праф. Цітарэнка Л. Р.)

**Пералік прац на прэмію імя А.Н. Сеўчанкі**

*Фізіка*

1. Даследаванне ўздзеяння высокаэнергетычнага выпраменьвання на рэчыва з мэтай стварэння новых матэрыялаў і тэхналогій (НДІ ПФП імя А.Н. Сеўчанкі, праф. Ганчароў В. К., м.н.с. па сумяшчальніцтве (аспірант) Казадаеў К. У., нав. сакратар, дац. Папечыц У. І., вяд. нав. супр. Пузыроў М. В.)

*Матэматыка*

1. Камплект падручнікаў “Рэчыўны і комплексны аналіз” у 6 ч. (праф. Зверовіч Э. І.)

*Біялогія і геаграфія*

1. Навукова-метадычныя асновы касмічнай геалогіі Беларусі (праф. Губін В. М.)
2. Цыкл прац “Альгафлора Беларусі: разнастайнасць, прадукцыйныя магчымасці, значнасць у экасістэмах, змены ў працэсе іх эвалюцыі” (д. біял. н. Міхеева Т. М.)

**Пералік прац на прэмію імя У.І. Пічэты для маладых навукоўцаў**

*Філалогія і журналістыка*

1. Навучальна-метадычны комплекс: Сеткавая прэса ў сістэме СМІ (дац. Градзюшка А. А.)

*Гісторыя, філасофія і эканоміка*

1. Манаграфія “Інавацыйны патэнцыял малога навукова-тэхнічнага прадпрымальніцтва Беларусі: сацыялагічны аспект” (к. сац. н. Паўлава К. Г.)
2. Навучальна-метадычны дапаможнік “Фарміраванне пазітыўнай прыхільнасці: ад чалавека да навакольнага свету” (ст. выкл. Бойка М. С.)

*Правазнаўства і міжнародныя адносіны*

1. Нарысы працоўнага права. Гісторыя, філасофія, праблемы сістэм і крыніц (дац. Тамашэўскі К. Л.)

**Пералік прац на прэмію імя А.Н. Сеўчанкі для маладых навукоўцаў**

*Фізіка*

1. Цыкл прац “Распрацоўка фізіка-матэматычных мадэляў, алгарытмаў і праграмнага забеспячэння для мадэлявання кінетычных з’яў у квантавапамерных прыборных структурах нанаэлектронікі” (вяд. нав. супр. Пазнякоў Д. В.)
2. Цыкл прац “Аптычныя і электрычныя ўласцівасці матэрыялаў Si, Cu(In,Ga)(S,Se)2 і Cd(S,Se) для стварэння эфектных сонечных элементаў і распрацоўка метадаў дыягностыкі сонечных элементаў” (дац. Мазанік А. В., ст. нав. супр. Ціваноў М. С., інжынер Зінчук В. В.)

*Матэматыка*

1. Комплекс прац па даследаванні асаблівасцяў напружана-дэфармаванага стану механічных сістэм ва ўмовах кантактнага ўзаемадзеяння і аб’ёмнага дэфармавання ў дачыненні да тэхнічных аб’ектаў адказнага прызначэння (ст. выкл. Шчарбакоў С. С.)

**Паводле інфармацыі НДЧ – ГУН**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**“Рэктар БДУ не раіць кіравацца пачуццём таварыскасці пры выбары прафесіі”** (“Звязда”, 22.05) – інтэрв’ю рэктара БДУ прафесара Сяргея Абламейкі.

**Узнагароджванне кардынала Філіпа Барбарэна, архіепіскапа Ліонскага званнем доктара honoris causa Інстытута тэалогіі БДУ** – БелТА (07.06, 08.06); БелаПАН (08.06); open.by (09.06).

**“Во шы бай э ло сы жэнь!”** (“Звязда” (06.06) – беларуска-кітайскі размоўнік, выдадзены Рэспубліканскім інстытутам кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ.

**“Віктар Іўчанкаў: “Айчыннаму мовазнаўству не стае фундаментальнасці і аналітызму”** (“Звязда”, 02.06, 03.06).

**“Лідарства па матэматыцы захоўваюць студэнты БДУ”** (“Настаўніцкая газета”, 30.05).

**“Конкурс в лицей БГУ в этом году составил 3,5-4 человека на место”** (БелаПАН, tut.by naviny.by, “Советская Белоруссия”, 28.05; БелТА, 30.05; open.by, 01.06; “Чырвоная змена”/”Звязда”, 05.06).

**“Тест-экзамен показал, кто знаний не растерял”** (“Рэспубліка”, 30.05).

**Трэніровачны тэст-экзамен па матэматыцы ў БДУ** (БелТА, 26.05).

**“Первые ласточки”** (“Во славу Родины”, 26.05) – выпуск офицеров военного факультета БГУ (также БелТА, 30.05).

**“Добры кіраўнік часта глядзіць у акно. І час ад часу – у люстэрка”** (“Настаўніцкая газета”, 26.05) – інтэрв’ю з кіраўніком праграмы MBA Інстытута бізнэсу і менеджменту тэхналогій БДУ Наталляй Макаевай.

**“В Парк по распределению”** (“Знамя юности”, 22.05).

**“Косава ў сэрцы”** (“Літаратура і мастацтва”, 22.05) – сустрэча з епіскапам Рашска-Прызранскім і Косаўска-Метохійскім Арцеміем на філалагічным факультэце БДУ.

**“Бригантина” в свободном плавании”** (“Во славу Родины”, 21.05) – міжнародны студэнцкі форум “Святло Вялікай Перамогі”, які адбыўся ў САК “Брыганціна” .

**Адкрыццё інфапункта Савета Еўропы ў БДУ** – БелТА (20.05, 08.06, 09.06); БелаПАН (08.06); naviny.by (08.06; 09.06); belradio.fm (21.05); interfax.by, tut.by (03.06, 08.06); “Советская Белоруссия”, “Звязда”, “Рэспубліка” (09.06); “Комсомольская правда в Белоруссии” (08.06).

**“Беларуская журналістыка ў даследаваннях студэнтаў БДУ”** (“Настаўніцкая газета”, 19.05).

**“IT-компании ужесточают отбор”** (“Экономическая газета”, 19.05) – форум SEF-2009.

**“Ковалев: Похоже, кризис достиг своего дна”** (tut.by, 18.05).

**“От пеленок до зачета” (“Рэспубліка”, 16.05)** – пра маладых маці – студэнтак БДУ.

**Рэспубліканская студэнцкая алімпіяда па матэматыцы прынесла БДУ 13 дыпломаў** (БелТА, 15.05).

**“Балтыйскі вектар”** (”Чырвоная змена”/”Звязда”, 15.05) – семінар “Праграма Балтыйскага універсітэта і Беларускі дзяржаўны універсітэт: рэальнасць і далягляды”.

**“История на дне раскопа”** (“Минский курьер”. 14.05) – практыка студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ.

**“Объединил Минск”** (“Минский курьер”, 14.05 ) – Міжнародны студэнцкі форум “Святло Вялікай Перамогі”, які адбыўся ў САК “Брыганціна” .

**“У БДУ студэнтаў-платнікаў на траціну больш, чым бюджэтнікаў”** (tut.by, belradio.fm, 14.05).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі паведамлялася таксама на беларускіх тэле- і радыёканалах.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

МАЛАДАЯ НАВУКА

# МОЦ АЛЬТЭРНАТЫВЫ

***Пераможцамі III Усерасійскай Інтэрнэт-алімпіяды "Нанатэхналогіі – прарыў у будучыню", якая прайшла 6 мая ў МДУ імя М.В.Ламаносава, сталі 3 выхаванцы БДУ.***

Вучань 11 класа Ліцэя БДУ Мікалай Малашчонак атрымаў дыплом I ступені ў секцыі "Хімія" сярод школьнікаў. Студэнт 5 курса хімфака Аляксандр Сцепановіч стаў дыпламантам II ступені ў секцыі "Нанаматэрыялы" і пераможцам конкурсу артыкулаў і праектаў па альтэрнатыўнай энергетыцы "Моц альтэрнатывы" групы "АНЭКСІМ". Выпускнік нашага хімфака Аляксандр Набіулін, зараз супрацоўнік НАН Беларусі, заваяваў дыплом III ступені ў секцыі "Канструкцыйныя матэрыялы" і дыплом пераможцы ў абсалютным першынстве па суме балаў ва ўсіх секцыях.

Пра алімпіяду расказаў нам Аляксандр Сцепановіч:

– Першы тур праходзіў дыстанцыйна – па Інтэрнэце. Пасля рэгістрацыі на сайце *nanometer.ru* ў абвешчаны дзень станавіліся даступнымі задачы інтэрнэт-тура. Іх трэба было рашыць на працягу двух тыдняў і адправіць арганізатарам. Затым па выніках адборачнага інтэрнэт-тура, у якім бралі ўдзел 5847 чалавек з 24 краін свету, 120 былі запрошаны на вочны тур, які праходзіў у Маскве. Ён складаўся з тэарэтычнага і эксперыментальнага этапаў. На першым даваліся камандныя заданні: з дапамогай сучасных прыбораў трэба было вызначыць невядомы нанаматэрыял. Удзельнікам творчага конкурсу (асобны ў рамках алімпіяды) трэба было выступіць з абаронай свайго праекта ці артыкула.



Асаблівасцю алімпіяды з'яўляецца тое, што ва ўдзельнікаў заўсёды ёсць выбар: рашаць усе ці толькі некаторыя заданні. Можна ўдзельнічаць толькі ў тэарэтычным ці толькі ў творчым туры, а можна і ў адным, і ў другім.

Акрамя таго, варта адзначыць і падзел на школьны і дарослы (для студэнтаў, аспірантаў, маладых навукоўцаў і ўсіх ахвотных) туры. У сваю чаргу, і ў школьнікаў, і ў дарослых было па некалькі секцый. У школьнікаў – хімія, фізіка, біялогія і матэматыка; у дарослых – нанаматэрыялы, канструкцыйныя матэрыялы, нанахімія, нанафізіка, нанамедыцына, нанаінжынерыя. А творчы конкурс быў для ўсіх аднолькавы, але перш за ўсё разлічаны на дарослых удзельнікаў.

***– Ты браў удзел у алімпіядзе ўжо трэці раз. Што змянілася ў арганізацыі за гэты час?***

– З кожным годам алімпіяда моцна змяняецца, так бы мовіць, імкліва эвалюцыянуе. У першай наогул не было вочнага тура, падзелу на секцыі, а таксама школьнага тура. З году ў год улічваюцца заўважаныя недахопы. Расце і маштаб алімпіяды, масавасць і геаграфія ўдзельнікаў, колькасць фундатараў. Але тым не менш застаюцца істотныя недапрацоўкі. Напрыклад, няпэўнасць рэгламенту, а таксама некаторыя праблемы з выдачай прызоў замежнікам (у тым ліку і беларусам).

***– Гэта значыць "усерасійскай" алімпіяда завецца, хутчэй, па старому?***

– Так. Справа ў тым, што існуюць нейкія крытэрыі, калі алімпіяду можна называць міжнароднай. А рэальна яна стала міжнароднай ад пачатку, бо сам фармат правядзення адборачнага тура праз Інтэрнэт мае на мэце максімальна пашырыць геаграфію ўдзельнікаў. І ўжо нават у першай алімпіядзе было шмат удзельнікаў не з Расіі. Акрамя расіян, якіх, натуральна, большасць, было шмат моцных юнакоў і з краін СНД, а таксама з Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі, ЗША, якіх не так многа. Стрымлівальны фактар – моўны: пакуль алімпіяда праводзіцца толькі на рускай мове. Наколькі я ведаю, у будучыні плануюць зрабіць англамоўны варыянт. Тады алімпіяда атрымае вельмі добры імпульс да развіцця.

***– Давай пагутарым непасрэдна пра твой удзел. Які з тураў (заданняў) табе падаўся найбольш складаным? І чаму?***

– Адназначна не скажаш. Хоць, хутчэй за ўсё, самым складаным быў адборачны інтэрнэт-тур. Ён так і задуманы, каб рэальна складаныя задачы ўдзельнікі парашалі ў спакойнай абстаноўцы, пашукалі па патрэбнай тэматыцы літаратуру, знайшлі артыкулы ў Інтэрнэце (гэта дазваляецца) і такім чынам адкрылі шмат новага для сябе. Дарэчы, для навукоўцаў вельмі важным з'яўляецца ўменне знаходзіць патрэбную інфармацыю. Арганізатары таксама адзначаюць, што задача алімпіяды не толькі выявіць наймацнейшых, але і навучыць чамусьці новаму, зацікавіць пачаткоўцаў, каб тыя ў далейшым захапіліся нанатэхналогіямі – сучасным і вельмі перспектыўным кірункам у навуцы.

***– Што ўяўляў твой уласны праект па альтэрнатыўнай энергетыцы?***

– Конкурс "Моц альтэрнатывы" арганізаваў буйны інвестыцыйны фонд "Група АНЭКСІМ", якая займаецца інвеставаннем у сферы высокіх тэхналогій, энергетыкі, нерухомасці і горнай металургіі. Як вядома, у наш час вельмі актуальная праблема замены традыцыйных крыніц энергіі на ўзнаўляльныя і экалагічна чыстыя, якія часта называюць альтэрнатыўнымі. Вось якраз па альтэрнатыўнай энергетыцы я і пісаў артыкул. Праца была агляднага плана. У ёй я аналізаваў стан альтэрнатыўнай энергетыкі ў свеце, якія перспектыўныя распрацоўкі з'яўляюцца ў апошні час, якія існуюць праблемы ў дадзеным кірунку, як развіваецца рынак тых ці іншых альтэрнатыўных крыніц энергіі.

**Марына САВІЦКАЯ**

На здымку:
Аляксандр Сцепановіч

МАНІТОРЫНГ

# ЖУРНАЛІСТЫКА ЯК НАВУКА



*Аксана Бязлепкіна*

***Навуковая дзейнасць – рэч сур'ёзная і адказная. А таксама захапляльная для тых, хто мае пошукавы імпэт. У журналістыцы таксама пошук і дапытлівасць у пашане. Як жа яна суадносіцца з навукай? Паспрабуем у гэтым разабрацца на прыкладзе 66-й навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў "Беларуская журналістыка–2009", якая нядаўна прайшла ў Інстытуце журналістыкі БДУ.***

На ёй юнакі і дзяўчаты выступілі з 243 дакладамі. Некаторыя з іх нават бралі ўдзел у працы адразу некалькіх секцый. Напрыклад, Ілья Лапато, які паказаў дасведчанасць у праблемах паліталогіі журналістыкі, лінгвістыкі, рэдагавання і медыярыторыкі, а таксама гісторыі журналістыкі. Усе яго тры выступленні на розныя тэмы прыцягнулі ўвагу. Але найбольшую цікавасць выклікала навуковая праца "Рэлігійна-культурны аспект у гістарычным партрэце малой радзімы (даследаванне публіцыстычных і архіўных крыніц аб касцёле і кляштары кармелітаў в. Засвір Мядзельскага раёна), якая дапамагла яму стаць лаўрэатам першай ступені на Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ студэнтаў. Яго навуковы кіраўнік, загадчык кафедры гісторыі журналістыкі Пётр Дарашчонак, характарызуе гэту працу як цалкам самастойнае даследаванне студэнта з выкарыстаннем архіўных крыніц (у тым ліку і замежных), матэрыялаў друку, манаграфій, над якімі аўтар працаваў на працягу чатырох гадоў. На думку Пятра Леанідавіча, яна робіць важкі ўнёсак у справу адраджэння беларускай глыбінкі.

Мы пацікавіліся ў самога *Ільі Лапато*, што менавіта натхніла яго, студэнта журфака, на пэўныя высілкі ў навуцы. На што ён адказаў:

– На маю думку, варта паставіць пытанне так: чаму наогул ідуць на факультэт журналістыкі? Мне здаецца, большасць тут апынулася таму, што іх вабіць гэтая прафесія і яны адчуваюць імкненне да кантакту з людзьмі, а таксама жаданне быць заўсёды на месцы падзеі і расказваць пра яе іншым. У душы з'яўляецца такі ўнутраны агеньчык, які запальвае чалавека, і ён пачынае гэтым гарэць. А любоў, гарэнне ў добрым сэнсе слова вельмі дарэчы ў даследаванні: калі табе хочацца раскрыць, знайсці штосьці новае і ты працуеш над гэтым без супыну. Пэўныя якасці журналіста ў даследчай працы вельмі карысныя. Тая ж мэтанакіраванасць і настырнасць дазваляе знайсці часам самую неверагодную інфармацыю. Па-другое, уменне кантактаваць з людзьмі. Бо не кожны чалавек адразу адкрыецца, і не кожны чалавек хоча, каб яго інтэлектуальнымі здабыткамі, манаграфіяй або артыкулам карысталіся іншыя.

***– У якіх кірунках прыйшлося весці пошук?***

– Зразумела, архівы сталі самай галоўнай крыніцай. У нашай краіне іх нямала, і прыйшлося навучыцца арыентавацца, дзе і што менавіта шукаць. Адмоўны момант быў хіба толькі ў тым, што для тых, хто не з'яўляецца студэнтам пятага курса і аспірантам, доступ да некаторых дакументаў забаронены. У гэтыя хвіліны я вельмі шкадаваў, што не з'яўляюся сталым навукоўцам. Але мне ўдалося спалучыць некалькі пошукавых напрамкаў. Давялося размаўляць з тымі, хто нешта ведае па тэме, гутарыць з іншымі даследчыкамі, якія займаюцца сумежнымі даследаваннямі, праглядваць мясцовы друк, які ўзнімаў праблемы захавання спадчыны, наведвацца ў раённыя музеі і бібліятэкі. Як бачыце, дапамагла ўсё тая ж журналісцкая "жылка", якая ёсць у кожнага нашага студэнта. Калі гэтую "жылку" накіраваць у нейкую іншую сферу, то вынік будзе і там.

***– Ілья, а якая тэма цябе больш за ўсё хвалюе як маладога даследчыка?***

– Увогуле, мяне цікавяць каталіцкія ордэны на Беларусі. У прыватнасці, ордэн кармелітаў, які быў даволі распаўсюджаны на беларускіх землях у XVIII стагоддзі. Мая праца прысвечана аднаму з іх кляштараў, які разбураны. Зараз я працую над дзейнасцю кармелітаў на Магілёўшчыне, дзе знаходзілася іх 8 законных сядзібаў. У планах – даследаванне ўсіх 24 сядзібаў, якія існавалі на тэрыторыі Беларусі. Ордэн падзяляўся на дзве галіны: кармелітаў старажытных правіл і босых кармелітаў. На сёння ў нашай краіне працуюць толькі босыя кармеліты. Кармеліты старажытных правіл пасля 1864 года на Беларусь так і не вярнуліся. Няма даследчыкаў і іх дзейнасці. Гэта, зразумела, стварае некаторыя цяжкасці.

***– Якой дзейнасці ты ў будучым аддасі перавагу: журналісцкай ці навуковай?***

– Яшчэ пакуль не вызначыўся. Але нічога не бачу дрэннага ў тым, калі журналіст праяўляе цікавасць да навукі. Гэта добра ўплывае на яго як творчую асобу і робіць журналісцкую прафесію больш скіраванай.

Пра асаблівасці навуковай работы распавяла старшыня савета па навукова-даследчай рабоце студэнтаў і аспірантаў факультэта журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ, старшы выкладчык кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі *Аксана Бязлепкіна*.

– Нашы студэнты друкуюць журналісцкія матэрыялы на працягу года. І гэтыя тэксты патрабуюць ад іх зусім іншых намаганняў, стылю і падачы матэрыялу, чым тэксты навуковыя. Калі мы спрабуем зацікавіць іх навукай, то мусім заахвочваць не да даследавання і пісання наогул, як у іншых навучальных установах, а да даследавання і новага, нязвыклага для іх пісання. І ў гэтым галоўная складанасць. Таму студэнты Інстытута журналістыкі, якія актыўна займаюцца навукай, вымушаны выдаткоўваць свой талент адначасова на такія розныя тэорыю і практыку.

Тым не менш, сёлетняя канферэнцыя паказала, што студэнты цікавяцца навукай. Адметнасць нашай канферэнцыі ў выразнай практычнай скіраванасці: навука – гэта тое, што мае дачыненне да прафесійнай дзейнасці журналіста, да тэндэнцый, якія маюць месца ў сучаснай журналістыцы на метадалагічным, тэарэтычным і практычным узроўнях. Так, на пленарнае пасяджэнне звычайна выносяцца даклады, якія, з аднаго боку, рэпрэзентуюць актуальныя тэмы даследаванняў, што супадаюць са спецыялізацыямі асноўных кафедраў інстытута, а з другога боку – даклады, у якіх студэнты маюць магчымасць падзяліцца сваімі практычнымі дасягненнямі. Сёлета студэнткі спецыяльнасці "Інфармацыя і камунікацыя" Юлія Чорная і Юлія Міхалюк расказалі пра надзвычай паспяховы досвед падрыхтоўкі і правядзення другога PR-форума "Папараць-кветка", студэнт спецыяльнасці "міжнародная журналістыка" Дзяніс Місюля разглядаў маркетынгавыя стратэгіі замежных інтэрнэт-СМІ і іх уплыў на яго праект YouSmi.by, студэнт спецыяльнасці "Вэб-журналістыка" Дзмітрый Макарчук аналізаваў дзейнасць вучэбнай інтэрнэт-газеты WebSmi.by у кантэксце онлайнавых СМІ Беларусі. Студэнт 4 курса Дзмітрый Бобрык прапанаваў увазе аўдыторыі востры даклад паводле сацыялагічнага апытання "Практика-2008: мнение студентов". Гэта максімальна практычная і набліжаная да жыцця навука, тое, што выклікае шчырае зацікаўленне, бурныя эмоцыі, процьму пытанняў ад моладзевай аўдыторыі, тое, што натхняе студэнтаў на новыя праекты.



*Ілья Лапато*

На канферэнцыі працавала 13 секцый, сярод якіх і традыцыйная англамоўная "СМІ ў Беларусі і за мяжой", круглы стол аспірантаў кафедры сацыялогіі журналістыкі, а таксама секцыя "Вялікая Айчынная вайна ва ўдзячнай памяці беларускага народа", прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі. На адкрыцці канферэнцыі дырэктар Інстытута журналістыкі БДУ Сяргей Дубовік адзначыў ганаровымі граматамі лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў. Сярод іх Ілья Лапато, а таксама Галіна Паплаўская і Сяргей Андрыянаў.

**Ганна ЛАГУН**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

***За пяць месяцаў бягучага года выдавецтва БДУ падрыхтавала да друку 118 арыгіналаў-макетаў вучэбных, даведачных і навуковых выданняў. За гэты ж час выйшлі ў свет 150 кніг і брашур агульным аб'ёмам 1086,9 улікова-выдавецкага аркуша.***

***Больш падрабязна аб гэтым можна даведацца на сайце ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы (www.urir.bsu.by) у рубрыцы «Новые книги, анонсы месяца».***

**Испанский язык = Espanol. Lee y aprende.**

Дапаможнік склалі апавяданні, жарты, загадкі, вершы, а таксама лексічны і граматычны матэрыял, адаптаваны да ўзроўню двухгадовага курса вывучэння іспанскай мовы на факультэце міжнародных адносін.

*Каратаев Г. И.* **Геофизические методы исследований.**

У дапаможніку прыведзены асноўныя геафізічныя метады пошукаў і разведкі карысных выкапняў, якія прымяняюцца пры вывучэнні геалагічнай будовы тэрыторыі Беларусі.

*Смолич И. И.* **Водный режим растений.**




У курсе лекцый выкладаюцца пытанні воднага рэжыму раслін, разглядаецца ўзаемасувязь водаабмену раслін з асноўнымі фізіялагічнымі функцыямі раслінных арганізмаў.

*Боровская Е. А.* **Бухгалтерский учет.**

У курсе лекцый разглядаюцца пытанні тэорыі бухгалтарскага ўліку, сутнасць яго метадалогіі, правілы складання бухгалтарскіх праводак, адлюстраванне ва ўліку асноўных гаспадарчых аперацый, якія ажыццяўляюцца прадпрыемствамі.

**Компьютерные технологии = Computer.**

Мэта дапаможніка – сфарміраваць у студэнтаў навыкі і ўменні чытання, перакладу арыгінальнай навукова-тэхнічнай літаратуры па спецыяльнасці, а таксама развіць навыкі вуснага маўлення па дадзенай тэматыцы.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

БІЗНЭС-АДУКАЦЫЯ

# МВА – практыка-арыентаваная магістратура

*У часы эканамічнага крызісу падрыхтоўка кваліфікаваных кіраўнікоў бізнэсу і фінансістаў становіцца надзвычай актуальнай. Пра адметнасці праграмы МВА (магістратура бізнэс-адміністравання) гутарым з яе кіраўніком, намеснікам дэкана Інстытута бізнэсу і менеджменту тэхналогій БДУ Наталляй МАКАЕВАЙ.*



*Наталля Макаева*

**ДАВЕДКА**

Назва МВА з'явілася ў Амерыцы напрыканцы XIX ст., калі індустрыялізацыя справакавала попыт на адукаваных спецыялістаў і менеджэраў, здольных думаць на крок наперад і кіраваць прасунутымі кампаніямі, што пераходзілі на выкарыстанне аўтаматыкі.

Першая бізнэс-школа ў Амерыцы, Wharton Business School, адкрылася ў 1881 годзе ва ўніверсітэце Пенсільваніі – яна сёння ўваходзіць у пяцёрку вядучых бізнэс-школ гэтай краіны.

Напачатку праграма МВА не сустрэла разумення ў акадэмічных колах – лічылася, што даваць магістэрскую ступень за навучанне камерцыі супярэчыць маральным прынцыпам універсітэцкай адукацыі. З іншага боку, шмат прэтэнзій было і ад бізнэсоўцаў, якія лічылі праграму занадта акадэмічнай і адарванай ад жыццёвых рэалій.

***- Наталля Юр'еўна, у чым адрозненне праграмы МВА ад іншых магістэрскіх праграм?***

- Магістр бізнэс-адміністравання (Master of Business Administration) – вядучая прафесійная ступень у галіне бізнэсу, якая прызнаецца амаль у кожнай краіне свету і вызначае прыналежнасць да супольнасці прафесійных менеджэраў. Адрознасць МВА ад іншых праграм магістэрскага ўзроўню палягае ў скіраванасці на практыку. Тут студэнтам прапаноўваецца ажыццяўляць канкрэтны праект, адаптаваны да рэальнага бізнэсу, і падчас выканання гэтага праекта адбываецца набыццё глыбокіх тэарэтычных ведаў у абранай галіне. Наша задача не трансляваць веды – патрэбныя кнігі дарослы чалавек і сам у стане чытаць, – але навучыць знаходзіць праблемы, аналізаваць іх, адшукваць рашэнне і сілы ў сабе прымаць гэтыя рашэнні. Таму ў навучальнай праграме шмат кантактных, аўдыторных гадзін – 900 на два гады навучання, лекцыі адбываюцца ў выглядзе абмеркавання праблем рэальных кампаній. Уся бізнэс-адукацыя будуецца на інтэрактыўных метадах навучання, прыкладам, на кейсах, якія прадугледжваюць папярэдняе самастойнае прачытанне студэнтамі тэорыі. Прытым важны не столькі сам кейс (хаця існуюць у практыцы МВА і кейсы-"бестселеры"), колькі методыка яго выкладання.

***- Чаму для паступлення на МВА абавязкова мець вопыт працы?***

- Калісьці амерыканскія бізнэс-школы прымалі студэнтаў адразу па атрыманні імі ступені бакалаўра, але зараз большасць такіх устаноў патрабуе ад абітурыентаў мінімум двухгадовага стажу працы, а ў вядучых школах – чатырохгадовага. У дакуменце EFMD (European Foundation for Management Development) "Кіраўнічыя прынцыпы праграмы МВА" гэтая праграма вызначаецца як "праграма змянення ці паскарэння кар'еры". Адсюль абавязковае патрабаванне практычнага стажу для тых, хто паступае да нас.

***- Ці здольная МВА сапраўды змяніць кар'еру таго, хто прайшоў праграму?***

- Многія мяняюць кар'еру нават не па заканчэнні, а ўжо ў працэсе навучання. Вось асабісты прыклад. Я прыйшла на праграму МВА БДУ (2003-2005 гг.) даволі сталым чалавекам, 36 гадоў, з салідная адукацыяй фізіка. Навучалася ў аспірантуры, калі абрынуўся СССР і разам з ім магчымасць займацца навукай. Працягваць навучанне і абараняць дысертацыю не мела сэнсу – трэба было выжываць. Пакінуўшы аспірантуру, працавала ў розных кампаніях (фінансавым дырэктарам, намеснікам главы прадстаўніцтва), праходзіла розныя курсы ў рамках карпарацыйнай адукацыі. Хацелася ўжо прэтэндаваць на кіраўнічыя пасады – для гэтага былі навыкі і досвед, але для іх пацвярджэння не хапала прафесійнага дыплома менеджэра. Гэта і стала першапачатковай прычынай паступлення на праграму, але само навучанне і вынікі пераўзышлі чаканні. Праграма МВА структуруе мысленне, дазваляе па-іншаму зірнуць на сябе, сваю справу і атачэнне. Ужо скончыўшы навучанне, я перайшла працаваць у кансалтынгавую кампанію, затым мяне запрасілі распрацаваць курс "Стратэгічны менеджмэнт" на англійскай мове, а ў 2007-м прапанавалі стаць кіраўніком праграмы ў ІБМТ. І такіх прыкладаў змены кар'еры можна прывесці мноства.

***- Ці розняцца МВА, якія можна атрымаць у Еўропе, Амерыцы і ў Расіі?***

- На Захадзе МВА – гэта другая ступень вышэйшай адукацыі. А ў Расіі – дадатковая адукацыя з наданнем кваліфікацыі "Майстар справавога адміністравання". Але змест праграм МВА не надта мяняецца ў розных краінах. Набор курсаў ахоплівае асноўныя сферы бізнэсу – кіраванне арганізацыяй, фінансы, маркетынг, вытворчасць, чалавечыя рэсурсы, лагістыку і іншыя, а таксама прадметы, скіраваныя на павышэнне кіраўнічых навыкаў і асабістай эфектыўнасці менеджэра – мастацтва прэзентацый, тайм-менеджмент, лідарства і праца ў камандзе, планаванне кар'еры.

***- Як развіваецца праграма ў Беларусі?***

- У нашай краіне праграма General МВА выкладаецца толькі ў Інстытуце бізнэсу і менеджменту тэхналогій БДУ, дзе пасля двухгадовага курса студэнтам прысуджаецца ступень магістра бізнэс-адміністравання. Існуе яшчэ такі кірунак, як Executive МВА, які прадстаўлены ў Беларусі ў Інстытуце прыватызацыі і менеджменту (ІПМ). Адно з абавязковых патрабаванняў у міжнароднай практыцы да тых, хто паступае на гэтую праграму, – не менш за сем, а ў асобных краінах за дзесяць гадоў кіраўніцкага вопыту. Мы з ІПМ не канкуруем – у нас розная мэтавая аўдыторыя. Мы бяром людзей з вышэйшай адукацыяй і стажам не менш за 2 гады пасля заканчэння ВНУ.

***- Летась на праграму МВА побач з дзвюма звычайнымі групамі былі набраны дзве англамоўныя. Распавядзіце, калі ласка, пра іх навучанне.***

- Наша праграма дае магчымасць навучацца на англійскай мове. Мова бізнэсу істотна адрозніваецца ад гутарковай – дзякуючы праграме студэнты атрымліваюць цалкам іншы ўзровень валодання мовай, пачынаюць разумець спецыяльныя тэрміны, вучацца чытаць фінансавыя дакументы. Пры паступленні ўзровень валодання англійскай тэстуецца, і абітурыентам даюць рэкамендацыі, ці варта яму ці ёй ісці ў англамоўныя групы. Націск робіцца на вывучэнне не мовы, а бізнэс-дысцыплін, таму важна, каб мова не перашкаджала разуменню і засваенню прафесійных ведаў. Плюс англамоўнай праграмы яшчэ і ў тым, што ў асноўным бізнэс-кейсы выдаюцца на англійскай. Бізнэс-кейсаў на рускай мове, падрыхтаваных нашымі выкладчыкамі МВА, пакуль няшмат, складанасць тут палягае ў закрытасці фінансавай інфармацыі беларускіх і расійскіх кампаній. Але навучанне ў англамоўных групах абыходзіцца даражэй – на сёння 16,2 млн рублёў у параўнанні з 13,5 млн за рускамоўную праграму.

***- Якім чынам ацэньваюцца веды ў межах праграмы?***

- Нам часам хочацца, каб за нашы грошы нам веды ў рот паклалі, разжавалі і далі шклянку вады запіць. Каб назаўтра прыйсці на працу з гатовым рашэннем і зарабіць мільён. Так не бывае. Падчас навучання на МВА даводзіцца вельмі шмат працаваць.

Уступныя іспыты на праграму МВА БДУ адбываюцца ў ліпені. Напрыканцы навучання студэнты абавязаныя напісаць і абараніць магістэрскую працу – гэта павінен быць не навуковы даклад, а рэальны практычны праект на прыкладзе канкрэтнага прадпрыемства. Каб захаваць высокі ўзровень адукацыі на праграме МВА і статуснасць дыплома, існуе мінімальны прахадны бал для допуску да абароны дыплома. У заходніх школах гэты бал амаль ніколі не бывае ніжэйшы за 8, у нас – 6. Пакуль што.

Падрабязней пра МВА БДУ можна даведацца на сайце *www.sbmt.by*

**Падрыхтавала**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

ДАСЯГНЕННІ

# НАЙЛЕПШЫ ПАДРУЧНІК

*Нацыянальны конкурс "Мастацтва кнігі – 2009", які ў пачатку мая ў 49-ы раз праводзіла Міністэрства інфармацыі Беларусі, вызначыў пераможцаў. У конкурсе прынялі ўдзел 39 выдавецтваў і выдавецкіх арганізацый, якія прадставілі на суд журы больш за 200 выданняў палепшанай якасці па 23 намінацыях.*

Выдавецтва БДУ (упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы) прадставіла для разгляду дзесяць кніг: Д.Л. Башкіраў, І.І. Шпакоўскі "История литературы Древней Руси"; У.В. Лысак "Микробиология"; Л.М. Чумак і інш. "Беларусь. Лингвокультурологический комплекс"; В.М. Анішчык і інш. "Физический факультет"; П.А. Каўрыга "Кліматалогія"; А.П. Салькоў, А.А. Яноўскі і інш. "Российские и славянские исследования". Выпуск 3; Т.М. Вараб'ёва і інш. "Свиридовские чтения". Выпуск 4; П.П. Украінец "Социология управления"; А.П. Астапеня і інш. "Учебно-научный центр "Нарочанская биологическая станция имени Г. Г. Винберга"; Г.Т. Маслава, А.В. Сідараў "Краткий атлас по биологии индивидуального развития".

Пашчасціла толькі адной. Дыпламантам намінацыі "Найлепшы падручнік" прызнана кніга аўтараў Галіны Маславай і Аляксандра Сідарава "Краткий атлас по биологии индивидуального развития" з электронным дадаткам. Выданне прайшло навуковае рэцэнзаванне і атрымала грыф Міністэрства адукацыі Беларусі, які даводзіць выкарыстоўваць атлас як вучэбны дапаможнік для студэнтаў ВНУ.

Атлас распрацававаны ў дапамогу студэнтам для самастойнай работы на лабараторных занятках па курсе эмбрыялогіі (біялогіі індывідуальнага развіцця). Утрымлівае арыгінальныя фотаздымкі і тлумачальныя схемы, якія адлюстроўваюць ход антагенезу ў жывёл.

Электронны дадатак (дыск) атласа мае інтэрактыўны блок, прызначаны для самападрыхтоўкі і самакантролю студэнтаў. Для лепшага разумення некаторых этапаў




індывідуальнага развіцця ў электронным дадатку ёсць навучальныя тэсты і кароткія відэаролікі, якія ажыўляюць асноўныя перыяды, дынаміку развіцця арганізма.

Наватарскі падыход да справы даў свой плён: кніга атрымалася карыснай і прыгожай за кошт ідэальнага спалучэння зместу і формы.

Над стварэннем арыгінала-макета атласа творча і карпатліва працавалі аўтары і выдавецкія работнікі. Заслугоўвае падзякі праца рэдактара Галіны Лазоўскай, мастацкага рэдактара Таццяны Таран, тэхнічнага рэдактара Таісы Рамановіч, а таксама кампутарная вёрстка Святланы Ягоравай. Стварэнне электроннага дадатку цалкам належыць аўтарам вучэбнага дапаможніка.

Галоўная задача конкурсу – вызначыць найлепшыя дасягненні ў мастацка-тэхнічным і паліграфічным выкананні прадстаўленых кніг.

І калі значная частка поспеху была прадвызначана таленавітай працай па стварэнні арыгінала-макета, то астатняе належыць друкарні РУП "Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта", яе тэхнічным магчымасцям і прафесійнаму ўзроўню супрацоўнікаў.

Віншуем усіх, хто меў дачыненне да стварэння падручніка новага ўзору, і запрашаем да ўдзелу ў новых цікавых сучасных праектах кнігавыдання.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы**

СТУДЭНЦКІ МЕРЫДЫЯН

# Вучоба па-кітайску



*Наталля Атрашкова (са сцягам у руцэ) і дзве іншыя выпускніцы БДУ, Кацярына Маслоўская і Ірына Бяспалая, разам з выкладчыкамі кітайскай мовы на адкрыцці спартыўных спаборніцтваў на універсітэцкім стадыёне*

У роднай Беларусі паступіць у ВНУ досыць складана. На самыя прэстыжныя спецыяльнасці конкурс дасягае 10 і больш чалавек на месца.

Што ж адбываецца ў Кітаі, самай густанаселенай краіне свету, дзе пражывае каля 1,3 млрд чалавек? Як жывуць і вучацца кітайскія студэнты?

За 5 гадоў вучобы ў БДУ не аднойчы даводзілася чуць скаргі студэнтаў пра перагружанасць навучальнай праграмы, недахоп часу на вучобу, грамадскае і асабістае жыццё.

Аднак, як кажуць, усё спазнаецца ў параўнанні...

Падрыхтоўка да паступлення ва універсітэт займае ў кітайскіх школьнікаў некалькі гадоў і, у літаральным сэнсе, з ранку да позняй ночы. Заняткі пачынаюцца ў 7.30 і доўжацца да самага вечара, калі трэба яшчэ зрабіць хатняе заданне на заўтра. Як прызнаюцца самі школьнікі, на сон застаецца вельмі мала часу.

Для паступлення ў ВНУ абітурыенты здаюць адзін агульны дзяржаўны іспыт, ад вынікаў якога залежыць, у якой ВНУ можна будзе працягнуць адукацыю. Для паступлення на тэхнічныя спецыяльнасці трэба здаць кітайскую і англійскую мовы, матэматыку, фізіку, хімію і біялогію, на гуманітарныя спецыяльнасці – кітайскую, англійскую, гісторыю і палітыку КНР, геаграфію.

Але паступленне, як вядома, гэта толькі пачатак.

У Чунцынскім універсітэце навучаецца больш за 58 тысяч чалавек. Усім студэнтам, нават тым, хто жыве ў самім горадзе, за невялікую плату даецца інтэрнат. Іх ва універсітэце, які разбіты на 4 кампусы, 52. У адным пакоі пражывае ад 4 да 8 чалавек. Ацяпленне, кандыцыянер, без якога жыццё ў субтрапічным клімаце няўтульнае, а таксама гарачая вада часта адсутнічаюць. Інтэрнаты студэнтаў Чунцынскага універсітэта падзеленыя на мужчынскія і жаночыя. Пры гэтым, каб не павялічваць і так вялізнае насельніцтва краіны, наведванне інтэрнатаў процілеглага полу забароненае.

Умовы пражывання замежных студэнтаў нашмат лепшыя. У кожнага асобны пакой з санвузлом, тэлевізарам, кандыцыянерам і Інтэрнэтам. Часам адміністрацыя універсітэта або Саюз замежных студэнтаў арганізоўваюць турыстычныя паездкі, каб паглядзець на славутасці Паўднёвага Захаду Кітая. Раз-пораз у інтэрнаце студэнты ладзяць французскія, бельгійскія, італьянскія, рускія, беларускія і іншыя нацыянальныя вечарыны, на якіх гатуюць нацыянальныя стравы, слухаюць музыку.

Звычайна пары заканчваюцца ў 12.00, аднак ёсць мноства цікавых дадатковых заняткаў, як лекцыі па культуры Кітая, факультатывы па мове або заняткі гімнастыкай тай чы і каліграфіі.

Што тычыцца пар кітайскіх студэнтаў, то яны могуць праходзіць абсалютна ў любы час. Ужо не выклікае здзіўлення, калі сустракаеш сваіх сяброў пасля пар у 21.00 у нядзелю. І ні разу не прыходзілася выслухваць незадаволенасці з гэтай нагоды. Вучоба – ужо радасць!

У канцы кожнага семестра трэба здаць 4-8 іспытаў, з адной магчымай пераздачай.

Неад'емным аспектам жыцця студэнта тут з'яўляецца ўдзел у спартыўных мерапрыемствах і проста заняткі спортам. Ужо прыкладна з 5 гадзін раніцы ў студэнцкім гарадку, дзе мы жывём, можна ўбачыць людзей, якія займаюцца бегам або гімнастыкай. Удзень стадыёны і пляцоўкі для гульні ў баскетбол і настольны тэніс – самыя папулярныя тут віды спорту – поўныя людзей.

Удзельнічаючы ў спартыўных і іншых мерапрыемствах, мы набылі мноства сяброў, якія дапамагаюць нам адаптавацца ў шматмільённым горадзе і штораз распавядаюць нешта новае пра гісторыю, культуру і сучаснае жыццё Кітая.

Ужо прайшло 8 месяцаў з моманту навучання ў Кітаі, а здаецца, што гэта яшчэ толькі пачатак...

**Наталля АТРАШКОВА,**
**выпускніца ФМА БДУ 2008 г.,**
**цяпер студэнтка**
**Чунцынскага універсітэта, КНР**

СУСТРЭЧЫ

***Кафедра раманскага моваязнаўства 18 сакавіка арганізавала сумесна з музеем "Дом Ваньковічаў" цікавыя заняткі з удзелам прадстаўніцы старажытнага роду.***

# ДЗЕНЬ У МУЗЕІ



У парадная гасцёўні дома-музея студэнты і выкладчыкі кафедры мелі магчымасць пагутарыць з Аляксандрай Ваньковіч, якая прыехала ў Беларусь з Нью-Йорка разам з мужам. Яна прапраўнучка ў 5-м пакаленні Эдварда Ваньковіча, які дзвесце гадоў таму пабудаваў сядзібу, дзе зараз размяшчаецца музей. Паважаная госця з дапамогай цудоўнай сілы сапраўдных твораў мастацтва разам з групай студэнтаў рамана-германскага аддзялення з задавальненнем акунулася ў атмасферу 19 стагоддзя з яго этыкетам і шляхетнымі манерамі, напалам пачуццяў і стрыманымі эмоцыямі, з яго падзеямі і захапленнямі. Антураж дапаўняўся тым, што гутарка вялася на мове Бальзака і Вальтэра.

Аляксандра Ваньковіч не першы раз наведвае гістарычную радзіму, але з моладдзю гутарыла ўпершыню, тым больш незвычайным быў для яе іх сумесны гістарычны экскурс, які выклікаў самыя цёплыя пачуцці.

Нагодай для яе візіту стала канферэнцыя да 180-годдзя Эмерыка Гутэн-Чапскага, з роду якога паходзіць яе муж Эдуарда Аранда Гадлеўскі.

Цяпер з дапамогай Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь распрацоўваецца новая праграма цыкла музейна-педагагічных заняткаў па тэме "Дом Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX ст.".

Асновай стане аповед пра творчы і жыццёвы шлях выбітнага мастака Валенція Ваньковіча (стрыечнага брата Эдварда). Праграма мяркуецца для школьнікаў і студэнтаў, якія вывучаюць замежную мову, і павінна сумяшчаць у сабе як элемент міжкультурнай камунікацыі, так і педагагічныя методыкі. Зацікаўленым будзе прапанавана паспрабаваць сябе ў ролевых гульнях, выканаць некалькі крэатыўных заданняў (на французскай і беларускай мовах), а напрыканцы адчуць сябе сапраўднымі ўдзельнікамі французскай майстэрні пісьма.

Цікава, што заняткі плануецца распачынаць каля ратушы на плошчы Свабоды, дзе музейны педагог раскажа пра жыццё Мінска ў XIX стагоддзі, тагачасную сістэму адукацыі, развіццё моды, змяненні ў архітэктуры і інтэр'ерах, але галоўным чынам пра густы і норавы беларускага народа. Усё для таго, каб стварыць адпаведны гістарычны фон і паўплываць на ўражанне кожнага ўдзельніка.

Мэта праекта – выхаванне павагі да гісторыі сваёй краіны, павышэнне інтарэсу да творчасці нашага слыннага земляка і актывізацыя ведаў, звязаных з французскай мовай і культурай Францыі.

**Мілана БУДЗЬКО**

ІМПРЭЗЫ

***Кафедра раманскага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ – адна з самых маладых ва універсітэце, і не толькі па часе стварэння: пераважнай большасці выкладчыкаў італьянскай мовы няма і 30. Магчыма, менавіта гэта шмат у чым вызначыла "каларыт" красавіцкіх італьянскіх вечароў Bell'Italia, якія з поспехам праводзяцца на філфаку з 2003 г.***




З'явіўшыся дзякуючы ініцыятыве "зуброў" італьянскага аддзялення С.В.Логіша, Л.С.Мельнікавай і студэнтаў другога выпуску (або, хутчэй, іх нежаданню здаваць апошнія іспыты сумленным шляхам), з 2003 г. вечары Bell'Italia сталі візітнай карткай італьянскага аддзялення і кожны год збіраюць разам выкладчыкаў, студэнтаў і выпускнікоў. Гэта не проста вечары самадзейнасці, дзе ўдзельнікі могуць выявіць свой творчы патэнцыял. З самага пачатку стала зразумела, што Bell'Italia аб'ядноўвае вакол сябе людзей, неабыякавых да Італіі. Любы нумар, любое выступленне дазваляе гледачу далучыцца да італьянскай культуры. Гэтаму спрыяюць як студэнты, так і выкладчыкі кафедры раманскага мовазнаўства, якія з вялікім імпэтам прымаюць удзел у розных нумарах.

З кожным годам італьянскія вечары становяцца ўсё больш папулярнымі і колькасць удзельнікаў увесь час расце, гэта студэнты і МДЛУ, і Беларускай акадэміі музыкі, і школы замежных моў "Streamline". Што датычыцца гасцей вечара, то сярод іх часта можна ўбачыць кіраўніцтва філалагічнага факультэта на чале з дэканам І.С.Роўдам, а таксама прадстаўнікоў амбасады Італіі ў РБ.

Сёлета вечар Bell'Italia набыў статус адкрытага конкурсу, і зараз пераможца атрымлівае арыгінальны дыплом "Бездакорны Давід". Удзельнічаць могуць усе ахвотныя!

**Вікторыя НАВУМОВІЧ**

ПАМЯЦЬ

# НЕЎМІРУЧЫ

***На філалагічным факультэце адбыўся вечар памяці выдомага фальклярыста, выхаванца альма-матэр Васіля Ліцьвінкі пад назвай "Абрадавая вясна Васіля Ліцьвінкі".***



*Васіль Ліцьвінка (1941-2007)*

Чалавек каларытны, натхнёны і дзейны, ён праз усё жыццё пранёс пачуццё захаплення народнай песняй, якое здолеў перадаць і сваім вучням. Васіль Дзмітрыевіч раптоўна памёр на 66 годзе, і ўжо амаль два гады яго няма разам з намі. Аднак памяць пра гэтага светлага чалавека, які з'яўляецца прыкладам адданага служэння народнай песні, адраджэння традыцыйнай культуры, жыве ў сэрцах тых, хто яго ведаў і любіў. Ён – жывы, бо жывая яго справа, працуюць яго вучні. Менавіта гэтая ідэя стала падмуркам для правядзення вечара памяці. Прычым арганізатары свядома не аднеслі мерапрыемства да гадавіны з дня нараджэння або смерці фальклярыста і спецыяльна выкарысталі сімволіку вясенняга адраджэння прыроды і светлых велікодных урачыстасцяў – дзень 23 красавіка (паміж Вялікаднем і Радаўніцай), які найлепшым чынам увасабляе думку аб жыцці таго, каго ўжо няма, але хто разам з намі.

Дадзенае мерапрыемства сімвалічнае яшчэ і таму, што адбылося яно ў Год роднай зямлі і напярэдадні 70-гадовага юбілею філалагічнага факультэта, на якім 40 гадоў працаваў Васіль Дзмітрыевіч. Кафедра тэорыі літаратуры і вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору (якую арганізаваў і на працягу 20 гадоў узначальваў В. Ліцьвінка і якая цяпер пры кафедры тэорыі літаратуры) разам з заслужаным харэографам і танцмайстрам Беларусі і проста сябрам Васіля Ліцьвінкі Мікалаем Котавым запрасілі 9 фальклорных калектываў з Петрыкаўскага, Столінскага і Пухавіцкага раёнаў, з Мінска, а таксама выканаўцаў аўтэнтычных народных песень спецыялізацыі "Этнафоназнаўства" з універсітэта культуры і мастацтваў.

Аддаць даніну павагі выдатнаму беларускаму фальклярысту прыйшлі родныя, сябры і калегі Васіля Дзмітрыевіча, прыехалі яго землякі са Століншчыны, спрычынілася да мерапрыемства і маладое пакаленне: выхаванцы сталічнай гімназіі № 17 г. (фальклорны ансамбль "Гасцінец"), студэнты філалагічнага факультэта БДУ (фальклорны ансамбль "Багач"), узорны фальклорны ансамбль "Жаваронанчкі" з БДПУ імя Танка. Вечар выдаўся цёплым па атмасферы і разнастайным па выступленнях творчых калектываў. Напачатку прысутных чакаў сюрпрыз – відэаролік з прамовы Васіля Ліцьвінкі перад сваімі землякамі ў Доме культуры Столінскага раёна. І загучала песня – задуменная, кранальная, шчымлівая, але бясконца родная – з вуснаў Майстра. І ён сам на экране – гаваркі, вясёлы, з прыемным мяккім голасам і россыпам дыяментаў-прыказак... У гэты момант усе далучыліся да суладдзя Часу, знікла даўніна і мінуўшчына, і быў толькі ён на сцэне. Сапраўдны. Жывы.

Далейшая праграма, у адпаведнасці з назвай, уключала веснавую тэматыку: ад гукання вясны праз юраўскі карагод, які вадзілі ў актавай зале і выступоўцы, і гледачы, да велікодных і валачобных святкаванняў. Напрыканцы асобную праграму "Жніво" прадставіў фальклорны ансамбль "Вербіца" Дома культуры МАЗ (мастацкі кіраўнік – Аляксандр Свірскі), сімвалічна "зжаўшы" вынікі мерапрыемства. Вечар пацвердзіў, што справа Васіля Дзмітрыевіча жыве, што памяць пра яго застаецца, што песня беларуская, якую ён так любіў, працягвае гучаць з вуснаў не толькі дарослых, але і маладога пакалення. Так было. Так ёсць. І так будзе.

**Таццяна МАРОЗАВА,**
**Таццяна ЛУК'ЯНАВА**

МАЙСТРОЎНЯ

# КВЕТКІ: СЁННЯ І ЗАЎСЁДЫ



*У вольны ад працы час Ларыса Стрыжак малюе. Малюе кветкі.*

Гэты занятак наўрад ці можна назваць арыгінальным. Ці мала людзей, прафесіяналаў і дылетантаў, захапляюцца акварэллю. Тым больш, што Ларыса – дызайнер, а прадстаўнікі яе творчага цэха, як правіла, не замыкаюцца ў вузкіх межах спецыялізацыі, запісанай у дыпломе. Дызайнер, калі трэба, і скульптуру вылепіць, і кнігу напіша, і кіно паставіць. Жыццё прымушае дызайнера быць шматгранным. Ларыса, дызайнер-графік па адукацыі, даволі паспяхова працуе ў сферы паліграфіі, а акрамя таго аддае немалую частку часу і душы выкладанню ў БДУ. Вучыць студэнтаў праектнай графіцы. І зусім нядрэнна, калі выкладчык не толькі тэарэтычна падкаваны ў сваім прадмеце, але і валодае практычнымі навыкамі ў той справе, якой навучае іншых.

Кветкі – гэта, мабыць, самы папулярны пасля эротыкі матыў мастацтва для народа. Кветкі – па-за часам і ідэалогіяй. Гэта прыгажосць у чыстым, рафінаваным выглядзе. І разам з тым гэта жывая прырода, зменлівая і вечная. У колерах Ларысу захапляе шматстайнасць формаў і фарбаў пры нязменнай, калі можна так сказаць, модульнай аснове. Дарэчы, у гісторыі культуры бывала, што нацюрморт, як жанр, стала "прапісаны" на перыферыі "вялікага Стылю", перамяшчаўся ў цэнтр глядацкай увагі. Тады публіка, змарыўшыся ад ідэалагічнага афіцыёзу, які цісне на псіхіку, знаходзіла ў простых, звыклых, вечных праявах прыгажосці эмацыйную аддуху.

Ларыса піша кветкі не на продаж. Для сябе. Для душы. Дзеля творчага самавыяўлення. Шчырасць яе жывапісу падкупляе і знаўцу, і прафесіянала. Яе жывапіс вонкава няхітры, але глыбока эмацыйны.

Зрэшты, мне, які ведае Ларысу са студэнцкіх гадоў, выстава яе работ (ладзілася ў маі ў памяшканні гарадской бібліятэкі № 5 – ***заўв. Рэд.***) цікавая не канкрэтыкай экспазіцыі, а самім фактам, што яна адбылася. Мне прыемна думаць, што ў маёй аднакурсніцы ёсць час, а галоўнае – жаданне рабіць штосьці апроч працы, штосьці, за што не плацяць заробак. Оскар Уайльд сцвярджаў, што мастацтва толькі тады сапраўднае, калі яно практычна бескарыснае. Акварэлі Ларысы Стрыжак цалкам адпавядаюць гэтаму азначэнню.

**Пётр ВАСІЛЕЎСКІ**

СЛОВА СТУДЭНТУ

***Калісьці даўно чалавек абвясціў сябе "царом прыроды", і да якіх жудасных наступстваў гэта прывяло: высечаны лясы, знішчана шмат відаў раслін, забруджана навакольнае асяроддзе. Страчана сувязь паміж чалавекам і прыродай, парваны тыя нябачныя ніткачкі, якія калісьці звязвалі іх. Чалавек зняволіў прыроду, прымусіў яе працаваць на сябе. А ў выніку ў пачатку XXI стагоддзя экалагічныя праблемы сталі аднымі з самых важных.***

# ТАНЕЦ ДАЖДЖУ

Сёння чалавек спрабуе загладзіць сваю віну перад прыродай, напрыклад, праводзячы суботнікі. Але, на жаль, вынікі большасці з іх роўныя нулю, дзякуючы шматлікім нашым "слаўным" грамадзянам, якія так імкнуцца "ўпрыгожыць" вуліцы Беларусі свежымі акуркамі, пляўкамі і ўсялякім папярова-цэлафанавым смеццем. Не ведаю, як вы, але асабіста я лічу: свіння на вуліцы – і ў душы свіння.

Ці чулі вы, што ў глыбокай старажытнасці шматлікія народы, а некаторыя плямёны і па сённяшні дзень, выконвалі абрад, дакладней, танец, вымольваючы ў багоў паслаць дождж на зямлю, каб выратаваць свой ураджай ад засухі? Напэўна, хутка вялікая колькасць жыхароў Беларусі пачне збірацца на цэнтральнай плошчы ў Мінску і выконваць танец. Танец, які выклікае дождж і змые ўвесь бруд з нашай зямлі.

Мы павінны памятаць, што чалавек і прырода – паняцці непадзельныя. Знішчаючы прыроду, чалавек асуджае сябе на гібель. Не трэба забываць і пра тое, што мы ў адказе перад тымі, хто жыў на гэтай зямлі, а яшчэ больш – перад тымі, хто будзе жыць пасля нас.

І калі людзі будуць памятаць гэтыя "простыя ісціны", прытрымлівацца іх, то, глядзіш, гадоў праз пяць-шэсць прагулка па мясцінах нашай краіны прынясе задавальненне, а не адчуванне таго, што з'яўляешся неад'емнай часткай сметніку. І не прыйдзецца карыстацца метадам нашых продкаў – выконваць танец даждж...

**Аліна МІНАХАРАН**

ВІНШУЕМ!

## Уладзімір ЗЯНЕВІЧ:

# "ВЫКЛАДЧЫК, ЯКІ СПЯВАЕ, ЦІКАВЫ ДЛЯ СТУДЭНТА"

***Народны хор народнай песні "Родніца" БДУ нядаўна адзначыў свой 30-гадовы юбілей святочным канцэртам на сцэне філалагічнага факультэта ў прысутнасці вялікай аўдыторыі і сяброў хору.***



*Народны хор народнай песні "Родніца" БДУ на юбілейным канцэрце*

Павіншавалі юбіляраў і кіраўнік альма-матэр прафесар Сяргей Абламейка, а таксама старшыня прафкама супрацоўнікаў БДУ Яўген Туромша, начальнік упраўлення па справах культуры Уладзімір Макарэвіч, загадчыкі розных кафедраў.

Хор сабраў людзей, блізкіх па прафесіі і густах, у большасці сваёй выкладчыкаў. Некаторыя з іх спяваюць тут з самага заснавання калектыву і засталіся вернымі свайму выбару на ўсё жыццё. Ёсць у складзе хору і дваццацігадовыя юнакі і дзяўчаты, якія таксама цягнуцца да творчасці. Чым жыве зараз найстарэйшы творчы калектыў універсітэта? І якімі ідэямі сілкуецца? Пра гэта мы гутарым з мастацкім кіраўніком "Родніцы" Уладзімірам ЗЯНЕВІЧАМ.

***– Уладзімір Кузьміч, што трымае столькі гадоў розных людзей разам у вашым творчым калектыве?***

– Хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ "Родніца" – адзіны сярод айчынных ВНУ. Толькі наш універсітэт у часы перабудовы здолеў захаваць такі вялікі мастацкі калектыў. І гэта было няпроста. Бо ломка грамадска-палітычнай сістэмы суправаджалася і ломкай свядомасці. Многія, каб знайсці сябе ў новых умовах, пакідалі нават сваю педагагічную і навуковую дзейнасць, не гаворачы ўжо пра спевы ў хоры.

На маю думку, у свядомасці і ў душы чалавека павінны быць закладзены нейкія базавыя каштоўнасці: паняцці пра дабро і зло, уяўленні пра прыгожае і брыдкае, пра маральнае і непрыстойнае... Сёння ў творчай практыцы ёсць шмат таго, што падаецца як мастацтва, хоць насамрэч такім не з'яўляецца. Паступова ў свядомасці, асабліва моладзі, старыя з'явы і феномены набываюць іншы, новы змест і сэнс. Напрыклад, сапраўды прыгожае, высокі прафесіяналізм і мастацкая дасканаласць музычнай класікі, якасць увогуле не ўспрымаюцца многімі сучаснікамі як вартае ўвагі, наадварот, формы агіднага, што распаўсюджваюцца праз СМІ, успрымаюцца як эстэтычны і, шырэй, жыццёвы ідэал. Людзі ж, якія наведваюць хор "Родніца", – гэта перш за ўсё носьбіты традыцыйнай народнай культуры з усімі яе фундаментальнымі каштоўнасцямі: павагай да працы і людзей працы, творчых здольнасцяў чалавека, прыроднай дабрынёй, далікатнасцю, спагадлівасцю. Таму, як бы няпроста ні было жыць у тыя 90-я гады, яны ўсё ж змаглі, абапіраючыся вось на гэтыя сапраўдныя каштоўнасці беларускага народа, захаваць сваю асабістую ідэнтычнасць і сябе як асобу.

***– Наколькі патрэбны ваш хор для нашага ўніверсітэта? У чым важнасць яго дзейнасці?***

– На першы погляд здаецца, што гэта толькі бюджэтны расходны артыкул: пэўныя сродкі на пашыў касцюмаў, транспартныя выдаткі, каштоўны час на падрыхтоўку і правядзенне канцэртаў... Аднак у БДУ разумеюць значэнне культуры і мастацкай дзейнасці. І першыя памагатыя ў гэтым плане – прафкам супрацоўнікаў і ўпраўленне па справах культуры. На маю думку, падтрымліваючы мастацкія калектывы, універсітэт падтрымлівае сам сябе. Гэта адзін з надзейных механізмаў самаразвіцця.

Мастацкая дзейнасць разнявольвае чалавека, робіць яго творча свабодным, пашырае яго далягляды ўспрымання свету. І чалавек, выхаваны на творчасці, будзе гэтак жа крэатыўна займацца матэматыкай, фізікай, біялогіяй і ўсімі іншымі дысцыплінамі ВНУ. Студэнты ў сваю чаргу ўспрымаюць не проста прафесіянала, які суха выкладае свой прадмет, а чалавека як асобу творчую. Мы ўсе ведаем, што праца выкладчыка няпростая, звязаная з нервовым гарэннем. І калі перад табою моладзевая аўдыторыя, то прыходзіцца адпавядаць яе ўяўленням пра тое, якім мусіць быць выкладчык. Таму ў яго энергетыка, узровень жыццёвага запалу павінны быць мацнейшымі, чым у самых студэнтаў, каб мець магчымасць трансляваць ім свой вопыт і веды. Многія выкладчыкі-ўдзельнікі нашага хору гавораць, што падчас харавых заняткаў яны, як ні дзіўна (бо гэта ж напружаная праца), добра адпачылі і гатовыя на наступны дзень працаваць у вучэбных аўдыторыях з поўнай аддачай. Хор да ўсяго выконвае і камунікатыўную функцыю. У ім сабраныя людзі з розных факультэтаў, кафедраў, прафесійных сфер дзейнасці, розных узростаў, якія могуць абмяняцца досведам, і не толькі мастацка-творчым, але і жыццёвым, прафесійным, што дапамагае ім быць у курсе апошніх дасягненняў у галіне педагогікі і выкладання ў вышэйшай школе. Праз стасункі людзей розных пакаленняў працуе механізм пераемнасці.

***– Колькі чалавек зараз наведвае хор, і з якіх песень складаецца рэпертуар "Родніцы"?***

– На сёння ў хоры спяваюць каля 40 чалавек. Большасць з іх – ветэраны "Родніцы". Разумеем неабходнасць далучэння да нас універсітэцкай моладзі, бо калі мы жадаем "жыць" і надалей, то без пошукаў маладых і таленавітых не абысціся.

У аснове рэпертуару "Родніцы" – беларуская народная песня. Гэта наша місія – папулярызаваць нацыянальную традыцыйную песенную творчасць. Аднак, акрамя беларускіх песень, у нашым рэпертуары ёсць і рускія, і ўкраінскія народныя песні, а таксама аўтарская музыка. Часта мы так і выбудоўваем сваю праграму, каб паказаць сувязь славянскіх культур. Песні прыходзяць да нас рознымі шляхамі. Апошнім часам мы не ездзім усім хорам у фальклорныя экспедыцыі, бо гэта складана арганізацыйна і патрабуе немалых выдаткаў на транспарт. Карыстаемся ўласным архівам, матэрыяламі лабараторыі фальклору БДУ, а таксама песнямі, сабранымі вядомымі беларускімі фалькларыстамі.

За перыяд свайго існавання хор выканаў больш за 200 беларускіх народных песень. Наш рэпертуар пастаянна абнаўляецца: адны песні адыходзяць на другі план, іншыя становяцца больш актуальнымі. Сёння мы маем у рэпертуары недзе каля 30 песень, з якіх фарміруем канцэртныя праграмы.

***– Хор "Родніца" носіць званне народнага. Наколькі гэта важна для вас?***

– Народны хор — гэта не жанравае вызначэнне, а хутчэй статуснае. Для таго, каб называцца народным хорам народнай песні, трэба кожныя тры гады ўдзельнічаць у спецыяльных мастацкіх конкурсах. Толькі такім чынам можна пацвердзіць якасць сваёй праграмы і якасць свайго выканаўчага майстэрства. Якраз у гэтым красавіку мы атрымалі дыплом III ступені сярод харавых калектываў нашай краіны і маем права надалей называцца народным хорам, чым і ганарымся.

***– Ці ёсць у беларускай народнай песні свае слухачы? Куды выязджаеце з канцэртамі?***

– Мы выступаем як у Беларусі, так і за яе межамі. Летась у снежні мы ўдзельнічалі ў фестывалі ў Беластоцкім ваяводстве, арганізаваным беларускай праваслаўнай царквой сумесна з Міністэрствам замежных спраў Беларусі. Выязджалі і ў Латвію для ўдзелу ў сумесных мерапрыемствах БДУ і рыжскага ўніверсітэта. Спявалі на фестывалях у Нарвегіі, Расіі, Украіне, іншых краінах былога Саюза. Замежная публіка з вялікім задавальненнем слухае беларускую песню. На радзіме мы ўдзельнічаем ва ўсіх канцэртах, якія арганізоўвае наша ўніверсітэцкае ўпраўленне па справах культуры, а іх даволі шмат. Раённыя аддзелы культуры Мінска заўсёды запрашаюць нас на гарадскія святочныя мерапрыемствы. З задавальненнем выступаем перад ветэранамі вайны і ў спецыялізаваных санаторыях.

***– І апошняе. Ці лёгка патрапіць у ваш хор і стаць яго паўнапраўным сябрам?***

– Прыйсці да нас і паспрабаваць свае сілы можа кожны. Калі чалавек любіць родную Беларусь, яе культуру, народную матчыну песню, ён знойдзе тут усё для духоўнага задавальнення і ўласнай творчай рэалізацыі. Таму я запрашаю ўсіх выкладчыкаў і супрацоўнікаў далучыцца да хору "Родніца". Не забаронены ўваход і студэнтам. "Родніца" яднае людзей!

**Ганна ЛАГУН**

ШКОЛА АКТЫВУ

# ЗЛЯЦЕЛІСЯ НА ВЫСОКІ БЕРАГ!

***Дні 22-24 мая прайшлі для актыву БРСМ БДУ не зусім звычайна. Для ўсіх ахвотных быў арганізаваны турыстычны злёт, месцам правядзення якога абралі турбазу "Высокі бераг" у Стаўбцоўскім раёне. Актыўны адпачынак, нефармальныя зносіны, творчасць – менавіта дзеля гэтага хлопцаў і дзяўчат сабралі разам. Асабліва прыемным было тое, што падзея зацікавіла і студэнтаў з Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы.***



Яшчэ да выезду на турзлёт камандам было прапанавана аформіць свае лагеры паводле вызначанай тэматыкі, прычым гэта павінна было выяўляцца нават у такіх дробязях, як вонкавы выгляд, посуд і сам рытуал прыёму ежы. Акрамя таго, кожная каманда павінна была прыдумаць свой дэвіз, які і стаў іх "пропускам" на мерапрыемства. І, вядома, не абышлося без уласнага творчага нумара, дзе студэнты змаглі выявіць усе свае таленты і годна прадставілі свае факультэты.

Першы дзень адзначыўся прыездам рэктара альма-матэр прафесара Сяргея Абламейкі, якому было прадстаўлена ганаровае права адкрыць турзлёт. Акрамя ўдзелу ў афіцыйнай частцы, рэктар пагутарыў з актывам, абмеркаваў вынікі зробленай за апошні час працы і ўхваліў найбліжэйшыя планы студэнтаў па правядзенні мерапрыемстваў. Пасля гэтага Сяргей Уладзіміравіч асабіста пазнаёміўся з камандамі, паўдзельнічаў у іх рэпетыцыях да творчага вечара. Затым усе ўдзельнікі і арганізатары занялі свае месцы перад сцэнай, каб прадставіць і ацаніць творчыя нумары.



*Шашлык з рэктарам С. Абламейкам і прарэктарам У. Суворавым*

Наступныя два дні былі не менеш насычанымі. Пасля агляду-конкурсу лагераў каманды правяраліся на спартыўную форму. Для гэтага арганізатары падрыхтавалі такія выпрабаванні, як "тэхніка пешаходнага турызму", "тэхніка воднага турызму", спартыўнае арыентаванне і турыстычная паласа перашкод. Апроч іншага ацэньваўся "камандны дух", а таксама творчы падыход да выпрабаванняў. У завяршэнне ўсіх чакаў "Вечар бардаўскай песні", які яшчэ больш згуртаваў каманды. Акцыя пацвердзіла, што БДУ – гэта вялікая дружная сям'я!

**Лаліта КАЦОРА**
Фота аўтара

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

***Вы калі-небудзь думалі, што трэба, каб стварыць сабе свята? Сабраць заплечнік, узяць сяброў і сесці на электрычку да Вязынкі... Над галавой ні аблачынкі, вакол вясёлыя твары, а ў галаве думкі пра тое, што студэнцкае жыццё складаецца менавіта з такіх падзей – сумесных выездаў на прыроду, тым больш туды, дзе збіраюцца ўсе факультэты тваёй альма-матэр.***

# СЦЯЖЫНКІ ЮНАЦТВА



БДУ ўжо не ўпершыню праводзіць вясновы студзлёт у Вязынцы – там, дзе бярэ пачатак думка нашага славутага песняра – Янкі Купалы. "Турсцяжына", конкурсы, рухавыя гульні, простыя размовы, і, вядома, даніна памяці Паэту – вось дзеля чаго 16 мая студэнты памкнуліся ў адно з самых прыгожых месцаў Беларусі. Можна было падумаць, што ты апынуўся на міжнародных спаборніцтвах – усе з торбамі, рэчамі і гітарай за спінай.

Пакуль усе збіраліся, на імправізаванай сцэне паказвалі сябе маладыя таленты. Але, вядома, галоўнай "фішкай" гэтага злёту была турсцяжына.

Кожны факультэт прадстаўляла свая каманда, а часам нават дзве! Для пачатку ім было прапанавана прыдумаць групавую "візітоўку" працягласцю не больш за пяць хвілін. Пасля гэтага каманды па чарзе ўцякалі на турсцяжыну, якая складалася з некалькіх этапаў: прадзіранне праз павуціну з канатнай вяроўкі, абіранне бульбы падручнымі сродкамі, хаджэння па зваленым ствале дрэва. Затым удзельнікі павінны былі адгадаць слова, якое паказваў іх капітан. Далей, не марудзячы ні хвіліны, усе беглі выконваць наступныя заданні – праспяваць разам песню і тэатральна яе паказаць, а ў завяршэнне – знайсці на паляне літары і скласці з іх слова. На ўсё быў ліміт часу, таму каманды бегалі з асаблівым імпэтам. Затым удзельнікі маглі адпачыць і падрыхтавацца да конкурсаў, якія запланавалі арганізатары.

Надвор'е было выдатнае, таму час ляцеў неўпрыкметку: хто спяваў пад гітару, хто гуляў у валейбол. На паляне была арганізаваная "палявая кухня", і кожны атрымаў порцыю "кашы ад рэктара", якую Сяргей Уладзіміравіч Абламейка асабіста і раздаваў. Ахвотныя маглі паўдзельнічаць у конкурсе "Гол дэкану", дзе трэба было забіць гол у вароты Івану Сямёнавічу Роўду. Тым, у каго гэта атрымлівалася, даставаліся прызы. Гэты конкурс выклікаў адмысловы ажыятаж у студэнтаў, сярод якіх дзяўчат было чамусьці больш. Калі прызы разабралі, арганізатары далі старт конкурсам.

Асабліва відовішчным быў конкурс на перацягванне каната, бо ў ім удзельнічалі і студэнты, і паважаныя кіраўнікі. Спаборніцтва было агульным, таму перамога залежала ад кожнага. Адным словам, павесяліліся ад душы! Але ўсё калі-небудзь заканчваецца, вось і гэтаму дню было наканавана завяршыцца. Час альбо на электрычку, альбо ў намёт. Вось так і прайшоў адзін з самых выдатных дзён у жыцці БДУ, які дагэтуль студэнты ўспамінаюць са словамі: "Эх, часцей бы так збірацца!"

**Лаліта КАЦОРА**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

***Сёлета аматарам пяра і чарніла трэба было зрабіць падвоены выбар: вызначыць і Містэра, і Міс Інстытута журналістыкі-2009.***

# ІНЬ І ЯН

Па пяць годных юнакоў і дзяўчат з напругай чакалі за кулісамі актавай залы на Кальварыйскай, 9 свайго выхаду. І зразумела, бо аўдыторыя зусім не простая. Уважлівыя і крытычныя студэнты-журналісты не зробяць зніжак на хваляванне, бяссонныя ночы і стомнасць дні падрыхтоўкі. Да таго ж конкурсантаў не мелі шмат часу і выходзіў на сцэну, а трэба было паспець заваяваць сэрцы гледачоў і дзвюх "палат" журы: мужчынскага і жаночага складу. Незвычайным было і тое, што суддзі працавалі не разам – адбылося поўнае расслаенне па гендэрным прынцыпе: жанчыны выбіралі найстатнейшага з хлопцаў, а мужчыны назвалі імя самай прыгожай дзяўчыны.

Шмат разнастайных дэфіле: у купальных касцюмах і вячэрніх строях, візітоўка, інтэрв'ю (куды ж без гэтага конкурсу на журфаку), рамантычнае прызнанне ў каханні і, вядома, творчы конкурс вырашылі лёс карон пераможцаў. Конкурсы юнакоў і дзяўчат адрозніваліся не толькі формай, але і зместам: калі жаночая палова вырашыла пайсці класічным шляхам – спевы ды танцы, то хлопцы здзівілі арыгінальным падыходам да пастаўленай задачы. Валянцін Балановіч (2 курс) агучваў урывак з мультфільма "Кунг-фу панда", Дзмітрый Баяровіч (2 курс) і Мікіта Найдзёнаў (1 курс) выступілі разам з гукарэжысёрам мерапрыемства Андрэем Масязовым у гурце Green Fance Band. Танец Максіма Шляхцёнка (1 курс) быў незвычайна гарманічным, бо абраны вальс быў відавочна поўнасцю сугучны з душэўным настроем выпускніка Суворăўскага вучылішча. Дзмітрый Шашалевіч (1курс) таксама танчыў, ды з такой пластыкай і энергетычным запалам, што адразу зачараваў усіх дзяўчат у зале.

Нельга сказаць, што прадстаўніцы слабага полу далёка адсталі ад юнакоў – удзельнікаў конкурсу. Былі цікавыя і маштабныя нумары-танцы ў Таццяны Нікіціной і Любові Бляяевай, цудоўная аранжыроўка песні і вакал у Вольгі Кушняровай і Аліны Абрамоўскай. Арыгінальнымі пытаннямі і сваёй харызмай падчас інтэрв'ю прыемна здзівіла Алеся Раньшына. У цэлым, мерапрыемства нагадвала спаборніцтва дзвюх камандаў, падзеленых, як і журы, па гендэрным прынцыпе.

Урэшце, Міс Інстытута журналістыкі-2009 стала **Таццяна Нікіціна**, Містэрам – **Дзмітрый Шашалевіч**. Віцэ-міс – Вольга Кушнярова, Віцэ-містэр – Дзмітрый Баяровіч. Гэтым разам было яшчэ адно нававядзенне – вызначаліся пераможцы ў асобнай намінацыі – "Зорная пара". Імі сталі Вольга Кушнярова і Максім Шляхцёнак.

Па словах члена журы, *дырэктара Інстытута журналістыкі Сяргея Дубовіка*, з кожным годам конкурс праходзіць усё цікавей. І нумары канкурсантаў адзначаюцца добрай падрыхтоўкай і цікавымі знаходкамі. Вызначыць пераможцаў было сапраўды вельмі складана. Цікава, што правілі адразу конкурс і юнакоў, і дзяўчат, – эксперыментаваць трэба. Здаецца, усё атрымалася.

*Арташэс Антанян – тэлевядучы АНТ:*

– Мне ўжо даводзілася судзіць падобныя мерапрыемствы. Ад журналістаў адразу чакаў чагосьці цікавага і арыгінальнага – і не памыліўся. Сугучнае спалучэнне адразу дзвюх галоўных намінацый не сапсавала ўражання, а наадварот, глядзелася выдатна. Здзівіла, што не было ніякага суперніцтва – удзельнікі падтрымлівалі адзін аднаго, рабілі сумесныя нумары.



*Дзмітрый Шашалевіч і Таццяна Нікіціна*

*Аксана Ліцкевіч – "Міс журфак–2008":*

– Карону перадаваць было вельмі прыемна. Адчуваецца пераемнасць пакаленняў. Мне спадабалася, што конкурсы скампанавалі, у дзяўчат не было праблемы шукаць сабе пару для дэфіле. Нас нарэшце не падвяла тэхніка, былі цудоўныя дэкарацыі, гук і падрыхтоўка конкурсантаў.

Захапляльнае шоу цягнулася тры гадзіны, але гледачы, толькі стросцы салодкі дурман свята, здзіўлена заўважылі позні час. Што ж, конкурсная планка Інстытута журналістыкі паднялася ў гэтым годзе не толькі для абітурыентаў, але і для арганізатараў падобных дзеяў. Будзем чакаць новых творчых ідэй і талентаў, якіх сярод студэнтаў-журналістаў, як выявілася, нямала.

**Кацярына РАМАНАВА**
Фота Ганны ЦІМАШЭНКІ

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

Падведзеныя вынікі конкурсу "Найлепшы педагог Студэнцкага гарадка БДУ". Конкурс быў праведзены ўдругі раз з мэтай удасканалення і актывізацыі дзейнасці педагагічных работнікаў інтэрнатаў у дзвюх намінацыях: "Найлепшы сацыяльны педагог" і "Найлепшы педагог-арганізатар". Экспертная камісія конкурсу вызначыла пераможцаў. Імі сталі: "Найлепшы сацыяльны педагог" – Палто Ірына Мікалаеўна з інтэрната № 2, у намінацыі "Найлепшы педагог-арганізатар" першае месца падзялілі Клапоць Вольга Васільеўна з інтэрната № 2 і Шчарбакова Наталля Іванаўна з інтэрната № 4.

***

У маі завяршылася круглагадовая Спартакіяда Студгарадка, якая праводзіцца штогод па 11 відах спорту. У 2008-2009 навучальным годзе перамогу па выніках усіх спаборніцтваў атрымала зборная каманда інтэрната № 2.

***

Таксама завяршыліся спаборніцтвы на Кубак дырэкцыі Студэнцкага гарадка – супрацоўнікі супраць студэнтаў. Спаборніцтвы праводзяцца 8-ы раз па 7 відах спорту (валейбол, баскетбол, міні-футбол, перацягванне каната, боўлінг, більярд, настольны тэніс). Гэтым разам перамога за супрацоўнікамі Студгарадка!

Студгарадок віншуе пераможцаў і дзякуе ўсім за ўдзел!

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 30 жніўня 2005 года

12 чэрвеня 2009 года
Падпісана да друку 10.06.2009 г.
Зак. 646. Тыраж 2000 экз. Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by